У ПАРЛАМЕНЦЕ
Генадзь НАВІЦКІ АДКАЗАЎ НА ПЫТАННІ ДЭПУТАТАЎ 2 стар.
ХТО ДАПАМАГАЕ БЕЖАНЦАМ? "УЦЁКІ ДА ЖЫЦЦЯ" 3 стар.
"ЗЯЛЁНАЯ КАРТА" Ў БЕЛАРУСІ
БЕЛАРУСЬ ПРЫНЯТА Ў МІЖНАРОДНУЮ СІСТЭМУ СТРАХАВАННЯ 2 стар.

МІНСК, ЗАХАРАВА, 28
"КУПАЛА ЗАГАВАРЫЎ ПА-КІТАЙСКУ" 3 стар.
СУСТРЭЧЫ Ў ЯХІМОЎШЧЫНЕ 4 стар.
ШМАТГАЛОССЕ
Віктар МАЦЮШЭНКА.
"ПАД БЕЛЫМ КРЫЛОМ..." (працяг) 5 стар.

УРАЖАННІ
ПРЭМ'ЕРА "КАЛІГУЛЫ" Ў РУСКІМ ТЭАТРЫ 4 стар.
БЕЛАРУСЫ Ў СВЕЦЕ
Уладзімір ЮЗВІК – ПРА СТАЛАСЦЬ ДУМАК І ЎЧЫНКАЎ 6 стар.
ЛІТАРАТУРНАЯ СТАРОНКА
Наталля АРСЕННЕВА "СВАТЫ" 7–8 стар.

АГУЛЬНАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА РАСПАЎСЮДЖВАЕЦЦА Ў 48 КРАІНАХ

Голас Радзімы

Штотыднёвая газета для суайчыннікаў за межамі Беларусі Выдаецца з 6 красавіка 1955 года

10 ліпеня 2002 года. № 28 (2794) Цана 142 рублі E-mail:golas_radzimy@tut.by

хроніка жыцця

З НАГОДЫ ДНЯ НЕЗАЛЕЖНАСЦІ

У беларускіх пасольствах, якія знаходзяцца ў многіх краінах свету, адбыліся ўрачыстыя прыёмы з нагоды Дня незалежнасці Рэспублікі Беларусь.

Напрыклад, па запрашэнні пасла Рэспублікі Беларусь ў Кітаі Уладзіміра Русакевіча на прыём у Пекіне прыйшло больш за 200 гасцей. Сярод іх — памочнік міністра замежных спраў КНР Лю Гучан, прадстаўнікі шэрага міністэрстваў, дзелавых і навуковых колаў Кітая, а таксама дыпламаты замежных краін, акрэдытаваныя ў КНР.

Ад імя кіраўніцтва Кітая Лю Гучан перадаў шчырыя віншаванні Прэзідэнту Аляксандру Лукашэнку і беларускаму народу ў сувязі з нацыянальным святам Беларусі.

АВІЯБОМБА Ў ВОЗЕРЫ

Авіяцыйная бомба часоў Вялікай Айчыннай вайны была знойдзена на дне возера Шчэбат у Лепельскім раёне Віцебскай вобласці.

Знайшоў яе мінчанін, які займаўся там падводным паляваннем. На месца прыбылі сапёры. Пасля непрацяглых падводных пошукаў вадалаз падняў на паверхню 50-кілаграмовую фугасную авіябомбу айчыннай вытворчасці (на здымку). Сапёры вывезлі небяспечную знаходку, якая праляжала ў вадзе больш за паўстагоддзя, і знішчылі.

Сёлета ў Беларусі знойдзена і знішчана ўжо больш за сто адзінак боепрыпасаў, якія засталіся ў зямлі і вадзе з часоў вайны.

Фота БелТА.

БЕЛАРУСЫ Ў НЬЮ-ЙОРКУ

Беларуская дэлегацыя прымае ўдзел у якасці назіральніка ў рабоце асноўнай сесіі Эканамічнага і сацыяльнага савета ААН, якая праходзіць з 1 па 26 ліпеня ў Нью-Йорку. Узначальвае яе пастаянны прадстаўнік Рэспублікі Беларусь пры ААН Сяргей Лінг.

Як паведаміла прэс-служба МЗС, асноўная тэма сесіі — "Роля развіцця людскіх рэсурсаў, у тым ліку ў галіне аховы здароўя і асветы, у працэсе развіцця". Акрамя таго, плануецца абмеркаваць пытанні сацыяльнай, эканамічнай, гуманітарнай і надзвычайнай дапамогі дзяржаў у выпадках стыхійных бедстваў.

ДЭЛЕГАЦЫЯ МУРМАНСКА Ў МАГІЛЁВЕ

Магілёў наведала дэлегацыя адміністрацыі Мурманскай вобласці і марскога параходства.

Госці пазнаёміліся з прадукцыяй малочнага і мясного камбінатаў, швейнай фабрыкі "Вяснянка", заводаў транспартнага машынабудавання і металургічнага, правялі перагаворы з кіраўніцтвам Магілёўскай прамысловай кампаніі. Гэты візіт магілёўчане расцэньваюць як своеасаблівую "разведку" мурманчан перад сустрэчай губернатараў Магілёўскай і Мурманскай абласцей, якая павінна пакласці пачатак эканамічнаму супрацоўніцтву двух рэгіёнаў Беларусі і Расіі.

НОВАЯ СПЕЦЫЯЛЬНАСЦЬ — ТЭОЛАГ

На базе гістарычнага факультэта Віцебскага дзяржаўнага універсітэта імя П.Машэрава ўпершыню ўводзіцца новая спецыяльнасць – тэолаг.

Хаця кафедра тэалогіі скіравана на гуманітарную свецкую спецыяльнасць, аднак рэкамендацыі абітурыентам тут дазволена даваць праваслаўным і каталіцкім свяшчэннаслужыцелям. Дарэчы, і да выкладання асобных тэалагічных дысцыплін таксама мяркуецца запрашаць святароў і выкладчыкаў духоўных семінарый і вучылішчаў як са сталіцы, так і з рэгіёнаў.

"ВІЦЯЗІ" СУПРАЦЬ ДЗІКІХ ПЧОЛ

Незвычайную аперацыю давялося выканаць днямі байцам аварыйна-выратавальнага атрада "Віцязь" з Віцебска.

На балконе сёмага паверха дома, што знаходзіцца на праспекце Будаўнікоў, пасяліліся дзікія пчолы. Нязваныя "кватаранты" паспелі звіць на балконе гняздо памерам з футбольны мяч. Выратавальнікі, нібы касманаўты ў скафандрах, здолелі закаціць "мячык" у мех і вывезці далёка за межы горада, прапанаваўшы пчолам жыццё на ўлонні прыроды.

Падрыхтавала Ларыса ЛАЗАР.

ВІВАТ, КАРАЛЕВА!

У Мінску ў Палацы Рэспублікі адбыўся III нацыянальны конкурс "Міс Беларусь-2002". Ён сабраў 17 прыгажунь – пераможцаў папярэдніх рэгіянальных тураў.

Заканчэнне на 3-й стар.

да 120-годдзя песняроў

Нацыянальны банк Рэспублікі Беларусь увёў у абарачэнне памятныя манеты, прысвечаныя 120-годдзю з дня нараджэння беларускіх паэтаў Янкі Купалы і Якуба Коласа.

Манеты выпушчаны ў двух варыянтах — сярэбраныя наміналам 10 рублёў і медна-нікелевыя наміналам 1 рубель. Сярэбраныя манеты выпушчаны тыражом 1 000 штук, маюць дыяметр 33 міліметры, масу каштоўнага металу 15,55 грама і 925-ю пробу сплаву. Медна-нікелевыя маюць тыраж 2 000 экземпляраў.

Нацыянальны банк Беларусі ўжо выпусціў 29 назваў памятных манет. Яны карыстаюцца попытам у нумізматаў, жыхароў краіны, іншаземцаў, якія набываюць іх для сваіх калекцый, а таксама для сувеніраў і падарункаў.

НА ЗДЫМКАХ: манеты, прысвечаныя 120-годдзю Янкі Купалы (уверсе) і Якуба Коласа (унізе).

Фота Віктара ТАЛОЧКІ, БелТА.

юбілеі

У ГОНАР КУПАЛЫ

Святы, прысвечаныя 120-годдзю з дня нараджэння Янкі Купалы, дасягнулі ў пачатку ліпеня свайго апагея.

Напярэдадні дня нараджэння паэта ў беларускай сталіцы адбыўся шэраг выстаў, канферэнцый, паэтычных святаў.

У выставачнай зале Міністэрства замежных спраў Беларусі адкрылася фотавыстава "Шляхамі Купалы і Коласа", падрыхтаваная фотаклубам "Мінск". Адбылася выстава дзіцячага малюнка па выніках купалаўскага пленэру.

А ў Доме літаратара паэты і пісьменнікі, навукоўцы і грамадскія дзеячы сабраліся на навукова-практычную канферэнцыю "Янка Купала і незалежнасць Беларусі".

Свой творчы падарунак песняру зрабілі мастакі аб'яднання "Пагоня", якія прысвяцілі юбіляру выставу "Зямля Янкі Купалы". Аматары купалавай паэзіі маюць магчымасць пазнаёміцца з яго літаратурнай спадчынай на кніжнай выставе ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі. Шостыя міжнародныя Купалаўскія чытанні "Янка Купала і еўрапейскі літаратурны працэс" адбыліся ў Дзяржаўным літаратурным музеі паэта. Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, Міжнародны фонд Янкі Купалы і купалаўскі музей арганізавалі ўрачыстую вечарыну, якая прайшла ў Нацыянальным тэатры імя Янкі Купалы.

Безумоўна, цэнтральнай падзеяй стала Рэспубліканскае свята паэзіі "Купалле" на радзіме паэта ў Вязынцы. Гучалі вершы паэта, песні і словы ўдзячнасці за яго бязмежную любоў да Бацькаўшчыны.

Да помнікаў паэту ў Вязынцы і Мінску леглі кветкі ад шматлікіх нашчадкаў.

Яўген КАЗЮЛЯ.

ПАДПІСКА-2002

Шаноўныя чытачы "Голасу Радзімы", каб наша сувязь не спынілася, раім паклапаціцца аб падпісцы. Нагадваем, што "ГР" уключаны ў падпісныя каталогі Беларусі, Літвы, Украіны, Казахстана, Таджыкістана, Кыргызстана, Малдовы, Расіі.

У іншых краінах лепш аплаціць атрыманне штотыднёвіка чэкам, даслаўшы яго ў рэдакцыю. Кошт гадавога камплекта для краін Еўропы — 50, астатніх — 60 долараў ЗША.

БУДЗЕМ РАЗАМ!

*NEWS FROM BELARUS * БЕЛОРУССКИЕ НОВОСТИ * BIALORUSKIE WIADOMOSCI * NOTICIAS DE BELARUS * БІЛОРУСЬКІ НОВІНІ *

у парламенце

ПЫТАННІ ДА ЎРАДА

Чацвёртая сесія Палаты прадстаўнікоў і Савета рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі завяршыла сваю работу. Адно з апошніх пасяджэнняў, дзе прысутнічалі разам дэпутаты і сенатары, было прысвечана адказам членаў урада на іх пытанні.



Фота БелТА.

Ацэньваючы сацыяльна-эканамічную сітуацыю ў краіне, прэм'ер-міністр Генадзь Навіцкі быў дастаткова самакрытычны. Ён паведаміў дэпутатам аб апошніх мерах урада, накіраваных на стабілізацыю эканомікі. Па яго словах, самае цяжкае становішча ў апошні час было ў аграрным сектары. Каб дапамагчы вытворцам сельскагаспадарчай прадукцыі, дзяржавай былі ўрэгуляваны цэны на мяса і малако, праведзена рэструктурызацыя запазычанасцей сельскіх гаспадарак за энерганосьбіты, зніжаны падатак на падтрымку сельгасвытворцаў з 5 да 2 працэнтаў і г.д. Дарэчы, гэтыя крокі абышліся дзяржаве ў 1,38 трыльёна рублёў. "Прынятыя меры дазволілі, на наш погляд, зняць найбольш вострыя пытанні па сельскай гаспадарцы. Але ўсё ж на сённяшні дзень мы знаходзімся яшчэ далёка ад вырашэння ўсіх праблем", — прызнаў Генадзь Навіцкі.

Па яго словах, ураду пакуль не ўдалося знайсці механізм аванса-вання сельскай гаспадаркі і паляводства, загрузіць на поўную магутнасць перапрацоўчыя прадпрыемствы, стварыць эфектыўную сістэму лізінга сельскагаспадарчай тэхнікі, якая дазволіць перааснасціць фермы і павысіць прадукцыйнасць у 5–6 разоў.

Таму на рашэнні гэтых задач і будзе ў першую чаргу сканцэнтравана ўвага ўрада.

Што ж тычыцца прамысловасці, то першапачатковая мэта — зніжэнне выдаткаў. Як адзначыў кіраўнік урада, у сувязі са зніжэннем цэн на газ і чыгуначныя перавозкі неабходна паменшыць выдаткі прыкладна на 20 працэнтаў. Адна з галоўных задач, якую ставіць перад сабой выканаўчая галіна ўлады, — стварэнне ўмоў для актывізацыі інвестыцыйнай дзейнасці. Першыя крокі ў гэтым накірунку зроблены: рост інвестыцый у гэтым годзе склаў толькі 6–7 працэнтаў. "Беларусь знаходзіцца ў пачатку гэтага шляху і пакуль істотна змяніць сітуацыю новаму ўраду не ўдалося", — адзначыў Генадзь Навіцкі.

Старшыня Савета Міністраў адказаў на пытанні і заўвагі дэпутатаў і сенатараў, часам вельмі крытычныя. Святлана Гіль, напрыклад, задала пытанне, што называецца, у лоб: "Дзе абяцаная лібералізацыя? Якія рыначныя механізмы плануе ўключыць урад, каб вывесці эканоміку з крызісу?" Вось што сказаў у адказ Генадзь Навіцкі: "Вы, напэўна, маеце на ўвазе, што трэба ствараць найбольш спрыяльныя ўмовы для развіцця малога і сярэдняга бізнесу. Так, я абсалютна з вамі згодны. Але ўсе нашы напрацоўкі ў гэтым накірунку было прапанавана ўключыць у праекты ўказаў і дэкрэтаў. Такую работу мы зрабілі яшчэ ў мінулым годзе. Зараз у дапрацаваным выглядзе тры ўказы і тры дэкрэты прадстаўлены на подпіс Прэзідэнту". Адказваючы на шэраг пытанняў дэпутата Віктара Кучынскага наконт адсутнасці ўмоў для развіцця бізнесу, кіраўнік урада сказаў наступнае: "Я лічу, што ў нашай краіне сітуацыя з 1990 года развівалася не самым горшым чынам у параўнанні з іншымі дзяржавамі пераходнага перыяду. А ў многім і нават лепш. Я не драматызую сітуацыю, як вы, бо нічога надзвычайнага не бачу. Больш таго, у нас якраз такое палітычнае і эканамічнае становішча, калі мы спакойна і крок за крокам будзем рабіць усё неабходнае, каб палепшыць тое, аб чым вы гаворыце".

Адказваючы на пытанні аб стане рэальнага сектара эканомікі, прэм'ер-міністр адзначыў, што трэба ўлічваць і фактар часу. Пэўныя зрухі ў гэтым накірунку ёсць. У прыватнасці, колькасць стратных прадпрыемстваў знізілася з 43 да 33, пад кантролем урада знаходзіцца выплата пенсій і зарплаты бюджэтнікам. І ёсць дынаміка паступовага руху наперад. "Цуда не адбудзецца. Але ўжо ў гэтым годзе мы адчуем нейкія станоўчыя вынікі", — лічыць Генадзь Навіцкі.

А на пытанне Уладзіміра Парфяновіча: "Ці не наспеў час падаць ураду ў адстаўку?", прэм'ер-міністр адказаў так: "Сённяшні ўрад і я асабіста як прэм'ер не толькі бачым праблемы, але і робім канкрэтныя крокі, якія павінны даць вынікі. Яны ўжо пачалі праяўляцца. Але галоўны эфект мы адчуем праз пэўны час. Я настроены па-баявому. Таму па сваёй ініцыятыве ў адстаўку падаваць не буду".

На пытанні членаў Нацыянальнага сходу адказвалі многія кіраўнікі міністэрстваў і ведамстваў Савета Міністраў Беларусі. Удзельнікі пасяджэння засталіся задаволенымі дыялогам прадстаўнікоў заканадаўчай і выканаўчай галін улады. Тым больш, што ў час гэтай сустрэчы была дасягнута дамоўленасць аб'яднаць намаганні ўрада і парламента па вырашэнні шэрага неадкладных пытанняў.

Ларыса ЛАЗАР.

НА ЗДЫМКУ: выступае Генадзь НАВІЦКІ.

коратка

"ЗЯЛЁНАЯ КАРТА" І Ў НАС

Беларусь прынята ў міжнародную сістэму страхавання "Зялёная карта". Цяпер аўтааматарам краіны не пагражаюць фінансавыя непрыемнасці на дарогах іншых краін. Уладальніку "Зялёнай карты" гарантавана поўная кампенсацыя нанесенага ўрону пры дарожна-транспартным здарэнні за мяжой.

Як расказаў генеральны дырэктар Беларускага бюро па транспартным страхаванні Пётр Кучэрын, пытанне аб прыняцці нашай краіны ў члены міжнароднай сістэмы абавязковага страхавання грамадзянскай адказнасці аўтаўладальнікаў было канчаткова вырашана 30 мая. Продаж беларускіх "Зялёных карт" пачнецца з 1 студзеня 2003 года.

Марыя АГАФОНАВА, БелТА.

МЯРКУЕЦЦА СКАРАЧЭННЕ ТАМОЖНЫХ ДАКУМЕНТАЎ

У Брэсце адбылося сумеснае пасяджэнне Рэспубліканскага клуба дырэктараў і Міжведамаснага савета па развіцці эспарту, у ходзе якога былі разгледжаны пытанні развіцця таможнага заканадаўства.

З дакладамі на пасяджэнні выступілі старшыня Дзяржаўнага таможнага камітэта Аляксандр Шпілеўскі, намеснік міністра замежных спраў Аляксандр Міхневіч.

У сваім выступленні А.Шпілеўскі закрануў пытанні, якія датычаць спрашчэння таможных працэдур, арганізацыі працы таможных органаў, стварэння больш спрыяльных умоў для паскарэння таможнага афармлення. У прыватнасці, было адзначана, што цяпер скарыстоўваецца да 2,5 тысячы розных таможных дакументаў, колькасць якіх неабходна скараціць. У гэтых мэтах ДТК мае намер правесці рэвізію мэтазгоднасці запаўнення таможных дакументаў. Плануецца таксама максімальна абмежаваць асабістыя кантакты пры таможным афармленні, што дасць магчымасць ліквідаваць карупцыю. У ліку перспектыўных накірункаў дзейнасці ДТК — падрыхтоўка новага Таможнага кодэкса, увядзенне інстытута "добрасумленнага ўдзельніка ВЭД", увядзенне сумеснага таможнага кантролю Беларусі і Польшчы і шэраг іншых ініцыятыў.

Намеснік міністра замежных спраў азнаёміў удзельнікаў пасяджэння з накірункамі работы МЗС у сферы ўдасканалення механізмаў падтрымкі знешняга гандлю, развіцця беларускага экспарту. У сваім выступленні ён прааналізаваў існуючыя праблемы і праінфармаваў аб прымаемых мерах па іх вырашэнні, у прыватнасці, даў абгрунтаванне эканамічнай мэтазгоднасці ўнесеных ва ўрад прапаноў МЗС для ўключэння ў пратакольны запіс будучага Прэзідыума Савета Міністраў у сферы развіцця знешняга гандлю.

БЕЛАРУСКІЯ МАСТАКІ Ў ФЛЕНСБУРГУ

У Фленсбургу (ФРГ) адкрылася выстава твораў беларускіх мастакоў.

Вялікая экспазіцыя ўключае карціны мінскіх майстроў Людмілы Шчамялёвай, Ігара Рымашэўскага, Зоі Луцэвіч, а таксама аўтараў з аб'яднання мастакоў "Квадрат", прадстаўленыя віцебскім Цэнтрам сучаснага мастацтва. На вернісажы адбыўся канцэрт групы "Крыві" і выступленне беларускіх дзяцей, якія знаходзяцца на аздараўленні ў Шлезвіг-Гальштэйне.

Выстава прадоўжыцца да канца ліпеня 2002 года.

здарэнні

У ВЫНІКУ АВАРЫІ НА ЧЫГУНЦЫ ЗАГІНУЛІ ШЭСЦЬ ЧАЛАВЕК

Трагедыя адбылася на чыгуначным пераездзе каля вёскі Тэўлі Кобрынскага раёна.

Грузавік "УАЗ" Кобрынскага лясгаса спрабаваў праскочыць пераезд на чырвонае святло семафора. Машыніст поезда "Прага—Масква", які рухаўся з хуткасцю 100 кіламетраў у гадзіну, спрабаваў тармазіць, але лакаматыў на поўнай хуткасці пратараніў грузавік. Па інфармацыі прэс-цэнтра УУС Брэсцкага аблвыканкама, поезд спыніўся толькі праз пяцьсот метраў. Увесь гэты шлях ён цягнуў перад сабой "УАЗ", у якім знаходзілася шэсць чалавек. Вадзіцель і леснікі, якія вярталіся з працы, загінулі на месцы.

экалогія

ВЫРАШАЮЦЦА ПРАБЛЕМЫ НАВАКОЛЬНАГА АСЯРОДДЗЯ

Беларусь стала месцам правядзення шэрага міжнародных канферэнцый і семінараў па пытаннях экалогіі.

У Нацыянальнай акадэміі навук прайшла II Міжнародная канферэнцыя па ахове пойм і нізінных балот Палесся, арганізаваная Мінпрыроды сумесна з НАН, Прадстаўніцтвам ААН у Рэспубліцы Беларусь, грамадскім аб'яднаннем "Ахова птушак Беларусі", Дарвінскай ініцыятывай па захаванні відаў (Вялікабрытанія), Фондам аховы навакольнага асяроддзя Міхаэля Ота (ФРГ) і Каралеўскім Таварыствам Абароны Птушак (Вялікабрытанія).

У Брэсце праведзены семінар "Экатурызм як рэсурс для развіцця рэгіёна і адзін з накірункаў у вырашэнні праблем дэградацыі навакольнага асяроддзя", арганізаваны грамадскім аб'яднаннем "Інтэрфорум" пры ўдзеле спецыялістаў Мінпрыроды.

У санаторыі "Пад'ельнікі" (Уздзенскі раён) адбылася міжнародная канферэнцыя "Захаванне і ўзнаўленне прыродна-гістарычных ландшафтаў: праблемы і перспектывы", арганізаваная грамадскім аб'яднаннем "Цэнтр гуманітарных ініцыятыў" сумесна з Міністэрствам прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя і Дзяржаўным музеем прыроды і экалогіі Рэспублікі Беларусь.

У Мінску Мінпрыроды сумесна з кафедрай міжнароднага турызму факультэта міжнародных адносін Беларускага дзяржаўнага універсітэта ініцыіравана міжнародная навуковая канферэнцыя "Стратэгія ўстойлівага развіцця экалагічнага турызму Беларусі".

сітуацыя

Фота БелТА.

У ВЫРАТАВАЛЬНІКАЎ НАПРУЖАНЫ ЧАС

З наступленнем гарачых дзён прыбавілася працы ў работнікаў выратавальнай станцыі "Усход" горада Брэста. У гэтым годзе пакуль не было няшчасных выпадкаў, але шмат клопатаў з-за пакінутых без нагляду дзяцей і дарослых у стане алкагольнага ап'янення. Сочачы за двухкіламетровым адрэзкам ракі Мухавец, брыгада выратавальнікаў мае толькі 5 хвілін на выратаванне чалавека, які тоне. Далейшая барацьба за яго жыццё практычна бессэнсоўная. Таму, грунтуючыся на вопыце, праводзяцца прафілактычныя дзеянні па папярэджванні няшчасных выпадкаў.

НА ЗДЫМКУ: на гарадскім пляжы Брэста.

хто дапамагае бежанцам?

УЦЁКІ ДА ЖЫЦЦЯ...

Калісьці ў прынца Садруддзіна Ага Хана, які шмат гадоў узначальваў Упраўленне Вярхоўнага камісара ААН па справах бежанцаў, спыталі, якую канчатковую мэту ставіць перад сабой УВКБ ААН. І ён адказаў: "Спыніць сваю дзейнасць". Іншымі словамі, сталы і дасведчаны чалавек марыць, каб настаў час, калі бежанцаў не застанецца. Ён думае пра змяненне свету. Сёння ж на пяці кантынентах каля 22 мільёнаў чалавек, якія, выратоўваючы ўласнае жыццё, вымушана пакінулі свае родныя мясціны і шукаюць прытулку ў іншых краінах ці перамяшчаюцца ўнутры сваёй.

Упраўленне Вярхоўнага камісара ААН налічвае каля 5 тысяч супрацоўнікаў, якія часта працуюць у экстрэмальных умовах, у час баявых дзеянняў, у прыватнасці. Дапамагаючы іншым, многія з іх рызыкуюць уласным жыццём. Такім чынам, Дзень бежанцаў — гэта падстава аддаць даніну павагі і гэтым людзям.

Сёлета Сусветны Дзень бежанцаў прайшоў пад знакам жанчын-бежанак. Характэрна, што 80 працэнтаў ад усіх бежанцаў у свеце складаюць менавіта жанчыны з дзецьмі. Відавочна, што гэта катэгорыя людзей мае асобыя патрэбнасці.

Вярхоўны камісар УВКБ ААН Рууд Луберс адзначыў у сваім пасланні да Сусветнага Дня бежанцаў: "Мы павінны рабіць усё, каб іх (жанчын) голас быў пачуты, каб іх магчымасці рэалізоўваліся і каб іх роля атрымала поўнае прызнанне".

Шляхам правядзення вучобы і іншых мерапрыемстваў жанчын неабходна ўводзіць у кіраўніцтва арганізацый, што займаюцца праблемамі бежанцаў. Дзеля забеспячэння гендэрнай роўнасці УВКБ ААН настойвае, каб жанчыны і дзяўчынкі атрымлівалі асабістыя, а не агульныя з мужчынамі дакументы. Гэта павінна павялічыць іх бяспеку, свабоду перамяшчэння і аблягчыць доступ да паслуг. УВКБ ААН дамагаецца, каб большая частка харчавання ў месцах масавага пражывання бежанцаў кантралявалася і размяркоўвалася жанчынамі.

Безумоўна, праблема бежанцаў не з'яўляецца асноўнай для Беларусі сярод міграцыйных пытанняў. Наша краіна — транзітная дзяржава. Штогод на яе тэрыторыі знаходзіцца, па розных ацэнках, ад 100 да 200 тысяч нелегальных мігрантаў. Але грамадства павінна дакладна разумець, што бежанцы — зусім іншая катэгорыя грамадзян. Гэта людзі, вымушаныя ўцякаць са сваёй краіны, каб выратаваць жыццё — сваё і дзяцей. Яшчэ адно адрозненне — яны абсалютна законна знаходзяцца на Беларусі, бо звярнуліся да дзяржаўных органаў з хадайніцтвам аб прадастаўленні статуса бежанца і з гэтага моманту маюць права на пражыванне ў краіне.

На пачатак чэрвеня статус бежанца на Беларусі мелі 623 іншаземцы. Большая частка з іх — грамадзяне Афганістана (479 чалавек). Затым па колькасці ідуць грузіны, таджыкі, эфіопы, азербайджанцы і палесцінцы. Ёсць сярод прызнаных бежанцамі таксама грамадзяне Камеруна, Індыі, Ірака, Ліберыі, Руанды. Большую частку бежанцаў на Беларусі складаюць мужчыны і жанчыны ад 18 да 59 гадоў. Старэйшых за 60 гадоў няшмат — 3 працэнты жанчын і 1 працэнт мужчын. Такім чынам, большасць бежанцаў — людзі працаздольнага ўзросту, у якіх ёсць дзеці, — гэта больш за дзвесце чалавек.

За апошні час у сферы міграцыйнай палітыкі на Беларусі адбыліся значныя змены. Летась наша краіна далучылася да Канвенцыі ААН аб статусе бежанцаў 1951 года. Прадстаўнік Вярхоўнага камісара ААН па справах бежанцаў на Беларусі Богдан Нагайла, падкрэсліўшы, што ў нас праблемы бежанцаў вырашаюцца цывілізавана, асабліва адзначыў заканатворчую дзейнасць парламента ў гэтай галіне. Нядаўна, да прыкладу, прайшло першае чытанне новай (трэцяй) рэдакцыі Закона Рэспублікі Беларусь "Аб бежанцах". Богдан Нагайла лічыць: "Паўнацэннае функцыяніраванне ў краіне працэдуры вызначэння статуса бежанцаў, якую ажыццяўляюць падрыхтаваныя супрацоўнікі міграцыйных служб, дазволіла ліквідаваць значны аб'ём неразгледжаных хадайніцтваў аб прадастаўленні прыстанішча, якіх 4 гады таму было больш за 2 тысячы. Цяпер жа колькасць заяў, па якіх няма канчатковага рашэння, знаходзіцца на кантралюемым узроўні".

Асноўная задача зараз — інтэграцыя бежанцаў у беларускае грамадства. Маецца на ўвазе адкрыццё новых працоўных месцаў, перакваліфікацыя спецыялістаў, дапамога ў пошуку жылля. Да прыкладу, у Стоўбцах УВКБ ААН адрамантавала інтэрнат, патраціўшы на гэта 20 тысяч долараў. Сюды пасялілі жанчын-бежанак з дзецьмі і многадзетныя сем'і — усяго 14 чалавек. Столькі ж месцаў у інтэрнаце было аддадзена беларускім грамадзянам.

Яшчэ адзін прыклад — у пасёлку Ліёзна Віцебскай вобласці для дзвюх афганскіх сем'яў УВКБ ААН выкупіла дом.

Нядаўна ў Віцебску быў адкрыты першы цэнтр часовага размяшчэння асоб, якія шукаюць прыстанішча. Гэта добры прыклад супрацоўніцтва паміж УВКБ ААН і органамі ўлады вобласці і горада. У Мінску ж УВКБ ААН і Міжнародная федэрацыя Чырвонага Крыжа сумесна арганізавалі медыка-сацыяльны цэнтр. Ён працуе як для бежанцаў, так і для беларускіх грамадзян. Дарэчы, цэнтрам кіруе афганскі ўрач, які атрымаў адукацыю ў нашай краіне.

Яшчэ адзін значны накірунак дзейнасці УВКБ ААН і яго прадстаўніцтва на Беларусі — садзейнічанне вяртанню бежанцаў дадому пасля таго, як сітуацыя на іх радзіме стане больш прымальнай. Заявілі пра гэта жаданне і некаторыя афганскія бежанцы, што жывуць у нашай краіне. УВКБ ААН на Беларусі спрыяе гэтаму працэсу.

Напрыканцы хацелася б прывесці меркаванне Рууда Луберса, які адзначыў мужнасць і стойкасць людзей, якія страцілі ўсё, што мелі, сталі бежанцамі і пры гэтым змагаюцца за сваё жыццё і жыццё сваіх дзяцей.

Алена СПАСЮК

дыпкур'ер

КУПАЛА ЗАГАВАРЫЎ ПА-КІТАЙСКУ

У Доме дружбы чыталі вершы Купалы па-ўкраінску і польску, на чэшскай і нават кітайскай мовах. Творы слыннага беларускага паэта дэкламавалі на сваіх родных мовах дыпламаты.

Беларуская мова гучала не толькі з вуснаў вядучага вечарыны паэта Леаніда Дранько-Майсюка, які падкрэсліў, што Янка Купала — стваральнік беларускай літаратурнай мовы, чалавек, дзякуючы якому ў свядомасці мільёнаў людзей Беларусь паўстала як незалежная краіна. На беларускай (і вельмі добрай) мове звяртаўся да прысутных Анатоль Дронь, пасол Украіны.

Вядома, што Янка Купала пісаў вершы на польскай мове, перакладаў на беларускую класікаў польскай літаратуры. Дырэктар Польскага інстытута, саветнік пасольства Польшчы Цэзарый Карпіньскі ўзнёсла і пранікнёна прачытаў "А хто там ідзе?"

А за ім (дыпламаты падкрэслілі, што адбылося гэта без папярэдняй дамоўленасці) і саветнік пасольства Чэхіі Уладзімір Лукашцік, і часовы павераны ў справах Францыі Алексіс Шахтахцінскі таксама дэкламавалі той самы славуты верш пра долю беларуса.

На кітайскай жа мове гучала Купалава "Жняя". Народны артыст СССР Ігар Лучанок, аўтар рок-оперы па матывах паэмы Я.Купалы "Тусляр", пацвердзіў на справе свае словы, што ён умее іграць на цымбалах. Было выканана шмат песень на вершы Купалы.

На вечарыне гучалі прыгожыя словы пра беларускага пісьменніка. Падалося слушным меркаванне пасла па асобых даручэннях МЗС Беларусі Уладзіміра Шчаснага: кожны народ рызыкуе растварыцца ў цывілізацыі, бо глабалізацыя наступае. Ёй можа процістаяць толькі такая моц, як постаць вялікага нацыянальнага пісьменніка. Творчасць Купалы не толькі захоўвае родную мову і нацыянальныя каштоўнасці, але і прымушае ўвесь свет пачуць пра Беларусь.

Фота Яўгена КАЗЮЛІ.

Алена СПАСЮК.

НА ЗДЫМКАХ: дырэктар Польскага інстытута, саветнік Пасольства Польшчы Цэзарый КАРПІНЬСКІ; пасол Украіны ў РБ Анатоль ДРОНЬ; пасол КНР у Беларусі Юй ЧЭНЬЦЗЫ; часовы паверaны ў справах Францыі ў РБ Алексіс ШАХМАХЦІНСКІ.

конкурсы

ВІВАТ, КАРАЛЕВА!

Пачатак на 1-й стар.

Арганізатары свята пастараліся. Кожнаму выхаду прыгажунь папярэднічалі яркія нумары. Канкурсанткі выходзілі на подыум у нацыянальных касцюмах, спартыўнай форме, купальніках, вячэрніх сукенках. Для першай намінацыі арыгінальныя мадэлі з ільну з аплікацыяй з саломкі зрабілі юныя стылісты Брэсцкага абласнога цэнтра творчасці і моладзі. Галовы дзяўчат упрыгожвалі кароны. Праўда, пакуль з залацістай саломкі.

А сапраўдную карону каралевы атрымала "Міс Беларусь-2002" — 22-гадовая студэнтка Інстытута сучасных ведаў брэстаўчанка Вольга Неўдах. Першай "Віцэ-міс" стала навучэнка Беларускага дзяржаўнага харэаграфічнага каледжа Наталля Кузьменка, а другой "Віцэ-міс" — будучы юрыст з Мінска Кацярына Таран. А затым, да захаплення гледачоў, на каралеву і яе світу праліўся "зорны дождж".

НА ЗДЫМКАХ: «Міс Беларусь-2002» — брэстаўчанка Вольга НЕЎДАХ (на 1-й стар.); у час правядзення конкурсу.

Фота БелТА.

анонс

СЛУХАЙ "БЕЛАРУСЬ"!

Радыёстанцыя "Беларусь" (рэдакцыя праграм на замежныя краіны) вядзе перадачы не толькі на беларускай, але і на англійскай мове (аўторак, чацвер), і на нямецкай (серада, субота).

Вяшчальная сетка — гэта прыкладна 120 гадзін у месяц, адпаведна чатыры гадзіны штодзённа.

У праграмах радыёстанцыі:

- інфармацыйныя выпускі, у якіх асвятляюцца найважнейшыя падзеі ў жыцці краіны;
- радыёсустрэчы з дзяржаўнымі, палітычнымі, грамадскімі, рэлігійнымі дзеячамі; навукоўцамі, пісьменнікамі, музыкантамі, спартсменамі;
- актуальныя грамадска-палітычныя, сацыяльна-эканамічныя, навукова-тэхнічныя і экалагічныя праблемы;
- праграмы аб шматвяковай нацыянальнай культуры, духоўных каштоўнасцях беларускага народа.

Перадачы радыёстанцыі "Беларусь" гучаць штодзённа:

- **ад 04.00 да 06.00 гадзін па мясцовым часе (01.00-03.00 паводле Грынвіча) на частотах 1170, 5970 і 7210 кГц;**
- **ад 22.00 да 00.00 па мясцовым часе (19.00-21.00 паводле Грынвіча) на частотах 1170, 7105 і 7210 кГц.**

музейная зала

ЗЯМЛЯ ЧАКАЛА СЫНА...

Вось ужо год працуе новы філіял музея Янкі Купалы "Яхімоўшчына". Яхімоўшчына – цікавы і адметны куток Беларусі, які красуе непадалёку ад Маладзечна (18-20 кіламетраў). Менавіта тут узрастаў і мужнеў талент народнага паэта. Працуючы ў 1906-1907 гадах памочнікам вінакура на бровары ў маёнтку пана Любанскага, Янка Купала напісаў вершы: "А хто там ідзе?", "Ворагам беларушчыны", "З песень нядолі", "Дайце мне волю", "Не тужы", "Што ты спіш?", "Там", "Поле роднае", "Пакіньма напуста на лёс свой наракаць", "Гэта крык, што жыве Беларусь"...

Пералік можна доўжыць. Але куды важней зазначыць, што малады паэт, апынуўшыся ў новых мясцінах свайго краю, стаў для іх родным сынам. Ён пранікся навакольнай прыгажосцю, жыццём простага люду, уражліва ўспрымаў народныя легенды і паданні той мясцовасці, якія потым сталі сюжэтамі яго ранніх паэм.

Да прыкладу, у аснову паэмы "Нікому" (1906) лёг аповед селяніна Яхімоўшчыны В.Парфена пра трагічнае вяселле Тамаша і Алены. О, як ён уразіў чулую душу паэта! З часоў прыгону жыла жахлівая гісторыя, але толькі ў Янкі Купалы яна стала паэмай.

Многія з вершаў, напісаных Купалам у Яхімоўшчыне, сталі зместам першага яго зборніка "Жалейка".

Ці ж можна аддаваць забыццю такое?

Ідэя ўшанаваць мемарыяльныя мясціны ў Яхімоўшчыне нарадзілася яшчэ ў далёкія 50-я гады XX стагоддзя ў першага дырэктара музея Янкі Купалы У.Луцэвіч. Яна знайшла падтрымку ў асяроддзі вучоных, пісьменнікаў, мастакоў. Першым крокам было ўсталяванне мемарыяльнай дошкі ў 1959 годзе на будынку праўлення саўгаса, колішняй афіцыны ці канторы бровара пана Любанскага. Гэты будынак мае пазначаную на ганку дату збудавання — 1900 год.

А дом, у адным з пакояў якога ў 1906–1907 гадах жыў Янка Купала, — яшчэ больш старажытная забудова (па дакументах — 1870 года). Больш чым за стагоддзе ў гэтым доме жылі многія сем'і, нараджаліся і выраслі дзеці. У 1982 годзе да 100-годдзя з дня нараджэння Янкі Купалы на гэтым доме была ўстаноўлена мемарыяльная дошка. У час працы над стварэннем філіяла музея "Акопы" супрацоўнікаў музея Янкі Купалы не пакідала думка пра ўшанаванне купалаўскай мясціны ў Яхімоўшчыне. Вяліся перамовы са старшынёй калгаса "Яхімоўшчына" Т.Божкам — чалавекам высокаадукаваным, з прыхільным стаўленнем да беларускай культуры, нястомным энтузіястам. Дзякуючы яго шматлікім намаганням, жыхары гэтага дома былі пераселены ў новыя цагляныя будынкі. І ў 1997 годзе вызвалены будынак перададзены на баланс Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы. З гэтага часу пачалася праца над стварэннем філіяла: рэстаўрацыя, рамонт, распрацоўка экспазіцыі. Адкрыццё ўсяго філіяла плануецца да 120-годдзя з дня нараджэння Янкі Купалы.

А 30 мая 2001 года адбылося адкрыццё літаратурнай экспазіцыі і мемарыяльнага пакоя філіяла музея "Яхімоўшчына".

Над экспазіцыяй працавала творчая група ў складзе: мастак Генадзь Чысты, экспазіцыянеры музея Фаіна Ваданосава і Глафіра Кушаль. У зборы экспанатаў для філіяла дапамагалі Марыя Чабатарэвіч і Ядвіга Раманоўская.

Адкрыла свята дырэктар музея Янкі Купалы Жанна Дапкюнас. Яна выказала шчырыя словы падзякі ўсім, хто душою і сэрцам, адданай працай спрыяў здзяйсненню колішняй мары Уладзіславы Францаўны, жонкі Я.Купалы, — першага дырэктара музея: будаўнікам з Маладзечна, старшыні калгаса Г.Божка, Міністэрству культуры Беларусі — за падтрымку фінансавую, супрацоўнікам музея і філіяла "Яхімоўшчына", аддзелу культуры Маладзечанскага райвыканкама.

Дывановыя дарожкі вядуць у залы музея. Ціха і асцярожна ступаюць першыя наведвальнікі па свежа пафарбаванай падлозе. Але хутка забываецца другараднае, бо экспанаты пераносяць у іншы свет, у час "Нашай долі" і "Нашай нівы", у час абуджэння беларускай нацыі, у час вялікага ўздыму.

Дакументы, творы, фотаздымкі, унікальныя прадметы той эпохі расказваюць пра няпросты і нялёгкі час у жыцці паэта, яго краю і народа...

Незвычайна прывабным і ўтульным паўстаў перад наведвальнікамі мемарыяльны пакой Янкі Купалы.

Людзям варта толькі глянуць на стол, на этажэрку, як робіцца зразумелым, што 24-гадовы Купала прагна лавіў кожны павеў часу, жыў у трывожным чаканні. З яго стала не сыходзілі газеты, кнігі, рукапісы... Гэта тут, у Яхімоўшчыне, у 1907 годзе нарадзіліся палымяныя радкі:

Чаго вам хочацца, панове?
Які вас выклікаў прымус
Забіць трывогу аб той мове,
Якой азваўся беларус?

Чаму вам дзіка яго мова?
Паверце, вашай ён не ўкраў,
Сваё ён толькі ўспомніў слова,
З якім радзіўся, падрастаў.

.....

Эх, кіньце крыўдамі карміцца, —
Кожны народ сам сабе пан;
І беларус можа змясціцца
У сям'і нялічанай славян.

Напасцю, лаянкай напраснай
Грудзей не варта мазаліць!
Не пагасіць вам праўды яснай:
Жыў беларус і будзе жыць!

.....

К свабодзе, роўнасці і знанню
Мы працярэбім сабе след!
І будзе ўнукаў панаванне
Там, дзе сягоння плача дзед!

А якія ж кнігі ў той час чытаў Янка Купала? На палічках творы Карскага, Міцкевіча, Выспянскага, Славацкага, Ажэшкі, Кандратовіча, Канапніцкай, Някрасава, Кальцова, Лермантава, Пушкіна, Ібсена, Горкага, Пшыбышэўскага, творы Байрана, Шэкспіра, Шылера, Сервантэса і іншых.

Непаўторна прыгожая яхімоўская зямля вартая вялікага паэта. Але самае галоўнае, што ўсе тут адчуваюць еднасць душ. Ушанаванне яшчэ адной купалаўскай мясціны спрыяе таму, каб у наш край, на нашу зямлю вярталіся яе вялікія сыны.

Алена БУРБОЎСКАЯ,
вучоны сакратар Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы.

Янка КУПАЛА

Малюнак М.БАСАЛЫГІ.

Акалічны народ гуслі
знаў гусляра;
Песня-дума за
сэрца хапала;
Вакол гэтай думы
дудара-званара
Казак дзіўных
злажылась нямала.

Кажуць, толькі як
выйдзе і ўдарыць як ён
Па струнах з
неадступнаю песняй, —
Сон злятае з павек,
болю цішыцца стогн,
Не шумяць
ясакары, чарэсні;

Пушча-лес не шуміць,
белка, лось не бяжыць,
Салавей-птушка
ў той час сціхае;
Паміж вольхаў рака, як штодзень, не бурліць,
Паплаўкі рыба-плотка хавае.

Прытаіцца да моху русалка, лясун,
Каня вечнага "піць" не заводзіць;
Пад звон-песню жывучых гусляравых струн
Для ўсіх папараць-кветка ўзыходзіць.

галерэя майстроў

ВОБРАЗЫ НАТАЛЛІ ДАГЕЛЬ

Работы выкладчыцы выяўленчага мастацтва віцебскай сярэдняй школы № 25 Наталлі ДАГЕЛЬ выклікаюць цікавасць у гараджан. На суд гледачоў яна прадстаўляе вырабы з керамікі і цудоўныя акварэлі.

Фота БелТА.

уражанні

КОЛЬКІ МОЖНА СЦЯРПЕЦЬ І НАВОШТА?

"КАЛІГУЛА" — ПРЭМ'ЕРА Ў РУСКІМ ТЭАТРЫ

П'еса Альбера Камю "Калігула", па якой Вітаўтас Грыгалюнас паставіў у Рускім тэатры аднайменны спектакль, – складаная і ў той жа час выйгрышная. Моцныя асобы, ракавыя страсці. Так шмат думак, ідэй, што часам літаратурны матэрыял здаецца наборам афарызмаў. Але гэтым і прыцягвае спектакль, які прымушае думаць.

Рэжысёр перанёс дзеянне ў свет сучасных "жалезных братоў" — байкераў. Спачатку гэта нават насцярожвае. Сапраўды, навошта такі ход? Здавалася б, кожнаму герою – свой час. Але паступова разумееш: не важна, дзе і калі з'явіцца чалавек, які прымусіць анямець ад велічыні свайго і сусветнага зла. Гэта магло здарыцца сёння і некалькі тысяч гадоў таму. У Старажытным Рыме і ў вашай сям'і. Якая розніца, хто ён — лідэр байкераў ці Цэзар, малады (Калігуле — 29 гадоў) ці сталы чалавек. Магчыма, менавіта на з'яўленне такой думкі ў гледача і разлічвалі аўтары спектакля.

Калігула з'яўляецца перад намі якраз пасля гібелі сваёй каханай. Ён з гэтым горам не справіўся. Узбунтаваўся, захацеў стаць свабодным, разумеючы, што гэта вялікае выпрабаванне. Адзін з герояў кажа, што такі Калігула незразумелы для натоўпу, "таму што тыя, хто не мае душы, ненавідзяць чалавека, у якога яе багата". Зайздросцяць, баяцца? А можа такім чынам усяго толькі хочуць захаваць сваю душу?

Калігула імкнецца да бязмежнай улады. Яму не хапае звычайнай павагі і любові. Ёсць жа Цэзонія, жанчына, гатовая заўсёды быць з ім. Але ён малады, ён максімаліст. У яго ўяўленні яна ніколі не параўнаецца з той, адзінай і страчанай назаўсёды. Часам, згадзіцеся, лягчэй марыць пра няспраўджанае і нерэальнае, чым прыняць таго, хто побач, як Божы дар, цуд і твой шанс выжыць. Усё ж такі разумеючы, што тую, адзіную, не вернеш, Калігула марыць ... пра Месяц. О, калі б у яго быў Месяц, тады наблізіўся б да свабоды, стаў бы шчаслівым.

А пакуль ён будзе бясчынствацъ. Не толькі забіваць бацькоў сваіх набліжаных, але і аб'яўляць, да прыкладу, голад у сваёй краіне. Так-так. Гай выдае спецыяльны загад аб стыхійным бедстве — голадзе. Яму не асмельваюцца пярэчыць. Ён жа ставіцца з пагардай да людзей за іх пакорлівасць і кажа, што хацеў навучыць іх думаць, паважаць чалавечае жыццё. Ён малады і не ведае, што чалавека вельмі цяжка ў чым-небудзь пераканаць, а прымусіць любіць ці паважаць што-небудзь — немагчыма.

Аляксандр Ждановіч (Калігула) выконвае сваю ролю імпульсіўна, мабільна, нават нервова. Ён вельмі жывы. Дарэчы, гэты акцёр кожны вечар з'яўляецца на першым нацыянальным канале ў ролі вядучага дзіцячай праграмы "Калыханка". Там – іншы вобраз. Гледзячы спектакль, спачатку здзіўляешся новаму амплуа, потым прывыкаеш, адкрываеш для сябе яшчэ адну грань акцёра. І ў рэшце рэшт яму верыш. Мабыць, не Камю, а менавіта А.Ждановіч здолеў пераканаць, што Калігуле больш за астатніх патрэбна спачуванне і літасць. Ён няшчасны, адзінокі, таму што не ў стане прыняць сваю ж думку – шукаць аргументы на карысць гэтага свету, калі ўжо сабраўся тут жыць. Ён марыць пра каханне, кажучы, што кахаць – значыць састарыцца разам. Гэтага якраз ён і не хоча. Забівае Цэзонію, адзіным зместам жыцця якой быў клопат пра Гая. Ён не можа забыцца побач з ёю. Нягледзячы на тое ці якраз з-за таго, што яна цярпела, калі Калігула гвалтаваў для забавы жанчын. Падыгрывала Гаю ў час спектакля, калі той выступаў у ролі "чароўнай Венеры" і танцаваў у балетнай пачцы ці прымушаў сваіх васалаў займацца бегам. У інтэрпрэтацыі В. Грыгалюнаса — гэта катанне на ролікавых каньках, калі кожны мае толькі адзін канёк. Спачатку глядач смяецца, але раптам яму робіцца страшна. Колькі ўніжэнняў гатовы сцярпець чалавек, і нашто яму ўсё гэта вытрымліваць?

Калігула – першы, хто з пагардай ставіцца да чалавека, які маўчыць, калі гвалтуюць ягоную жонку. Магчыма, Гай — адзіны шчыры чалавек у спектаклі. Ён можа дазволіць сабе гэтую раскошу — шчырасць — у сваім бясконцым імкненні да свабоды, не разумеючы, што яе, свабоды, не існуе.

Алена СПАСЮК.

ПАД БЕЛЫМ КРЫЛОМ...

ПАСЛЯСЛОЎЕ ДА IV УСЕБЕЛАРУСКАГА ФЕСТЫВАЛЮ НАЦЫЯНАЛЬНЫХ КУЛЬТУР

Аўтобусы з нацыянальнымі дэлегацыямі рушылі з Мінска калонай. Перад самай Лідай прыпыніліся, каб прычакаць тых, хто адстаў. Тут адбылася смешная і кранальная падзея: з пярэдняга аўтобуса высыпалі дзеці-афганцы. З вясёлым крыкам кінуліся на луг і пачалі качацца па траве.

— Гэта вам не горы ды камяні! Адчуйце, якая лагодная беларуская прырода, — жартавалі дарослыя.

На фестываль пад патранажам прадстаўніцтва на Беларусі Упраўлення Вярхоўнага камісара ААН па справах бежанцаў ехалі два гурты — афганскія дзеці і дзеці грузін з Абхазіі. Яны былі бежанцамі. Мімаволі я ўспомніў сваю размову з Богданам Нагайла, прадстаўніком Вярхоўнага камісара. Ён спачувальна гаварыў пра афганцаў і грузін, якія пакінулі радзіму пад пагрозай смерці і праследавання. Богдан падкрэсліў, што, з пункту гледжання УВКБ ААН, вельмі важна, каб беларускія грамадзяне разумелі, чаму гэтыя людзі апынуліся тут, і не глядзелі на іх як на праблему і крыніцу небяспекі. Бежанцам, з аднаго боку, трэба было даць шанц інтэгравацца ў беларускае грамадства, а з другога, магчымасць захаваць і развіваць сваю мову і культуру.

Працяг. Пачатак у № 27.

Упершыню я ўбачыў выступленне дзяцей-бежанцаў на гала-канцэрце ў Мінску 3 лютага 2002 года, калі падводзіліся вынікі абласных тураў IV Усебеларускага фестывалю нацыянальных культур. Былі прадстаўлены вакальна-харэаграфічныя ансамблі — афганскі "Пандок" і грузінскі "Самшабло". У складзе гуртоў былі хлопчыкі і дзяўчынкі розных узростаў.

Гродна сустрэў гасцей сцягамі і вялізнымі маляўнічымі плакатамі. Убачыўшы калону аўтобусаў, жыхары прывітальна махалі рукамі. Нас чакалі!

Фестываль пачаўся з святочнага шэсця ад гасцініцы "Беларусь". (Я мімаволі адзначыў сімвалічнасць: большасць нацыянальных дэлегацый прытуліла "Беларусь" — лепшая гасцініца Гродна). Шэсце расцягнулася не меней як на кіламетр. Ішлі аркестры духавой музыкі, барабаншчыцы, высока плыў беларускі бусел, які агортваў сваімі крыламі ўсю працэсію. Кожная дэлегацыя ішла пад сваёй шыльдай, у нацыянальных строях, з музыкай і песнямі.

Уздоўж тратуараў на працягу ўсяго шляху шчыльна стаялі людзі, якія вясёлымі крыкамі і апладысментамі віталі нацыянальныя суполкі. Ім адказвалі з задавальненнем. Здавалася, што на вуліцах Гродна пасля доўгага расстання сустрэліся добрыя знаёмыя ці суседзі. Завяршалі святочнае шэсце дзеці ў карнавальных касцюмах, да якіх далучаліся гледачы з шарамі, дудкамі і сцяжкамі.

Святочнае шэсце скіравалася да Гродзенскага абласнога драматычнага тэатра. Тут на збегу вуліц да Нёмана адбылося ўрачыстае адкрыццё фестывалю. Як сведчанне пераемнасці часоў, па вуліцы праскакалі коні. Легендарны Давід Гарадзенскі вітаў гасцей горада.

Памочнік Прэзідэнта Беларусі Іван Карэнда прачытаў прывітальны адрас Аляксандра Лукашэнкі да ўдзельнікаў і гасцей IV Усебеларускага фестывалю нацыянальных культур. Выступілі міністр культуры Рэспублікі Беларусь Леанід Гуляка, намеснік старшыні Камітэта па справах рэлігій і нацыянальнасцей пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь Уладзімір Ламека, старшыня Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір Саўчанка, старшыня Савета Рэспубліканскага цэнтра нацыянальных культур Георгій Егіазаран. Нацыянальныя суполкі перадалі гораду Гродна на памяць свае адметныя падарункі.

Намеснік міністра культуры Рэспублікі Беларусь, старшыня Рэспубліканскага арганізацыйнага камітэта Валерый Гедройц аб'явіў IV Усебеларускі фестываль нацыянальных культур адкрытым, і ў неба ўзляцелі галубы, а за імі паветраныя шары. На парапеце аблдрамтэатра ўспыхнулі фантаны халоднага агню. Маладыя хлопцы і дзяўчаты выканалі вянок танцаў народаў Беларусі, кампазіцыя якіх перайшла ў беларускую польку.

"Паміж Польшчай і Расіяй... Між Літвой і Украінай — полька беларуская!.." Быццам спецыяльна для такой справы напісаны словы гэтай песні! Танец захапіў усю плошчу. Танцавалі ўдзельнікі фестывалю ў розных нацыянальных касцюмах і гродзенцы, маладыя і старыя.

Потым адбыўся канцэрт-прывітанне. Кожная нацыянальная суполка давала свой нумар-візітоўку. Усе выступленні ўспрымаліся з вялікім імпэтам. Вялізная Савецкая плошча ў Гродне не змяшчала ўсіх гледачоў. Па розных вулачках сюды сцякаліся тысячы людзей.

У заключэнне першага дня быў феерверк "Агні народаў свету". Пашчыраваў Пятро Гуд, які некалі даследаваў, а потым выдаў кніжку пра мастацтва феерверкаў у Вялікім княстве Літоўскім. Ён пабудаваў праграму так, каб гледачы пазнаёміліся з гісторыяй японскіх, кітайскіх, арабскіх, індыйскіх і, што асабліва цікава, беларускіх піратэхнічных дзей.

Шкада толькі, так мне здаецца, што месца для феерверку было выбрана няўдала. Савецкая плошча вялікая, а ўсё ж абмежавана будынкамі. Для шырокага абзору больш прыдатнае ўзбярэжжа Нёмана. А люстра ракі дало б дадатковы эфект феерверку.

Я вяртаўся ў гасцініцу сярод узрушаных гродзенцаў, якія ішлі дадому пешкі, абмяркоўваючы падзеі фестывалю. Прадставіўся карэспандэнтам "Голасу Радзімы" і спытаўся пра ўражанні.

Юрый Груш, беларус: — Гэта самае лепшае і галоўнае свята для нашага горада. Яго нельга параўнаць па прыгажосці ні з якім іншым.

Надзея Кашко, беларуска: — Вельмі цікава паглядзець на гэтых людзей разам, на іх нацыянальнае адзенне і мастацтва. Кожны з іх ганарыцца, што ён украінец, яўрэй, паляк ці літовец. Гледзячы на іх, мы адчуваем свой гонар. Заўтра пойдзем на наш беларускі падворак і будзем размаўляць па-беларуску.

Браніслаў Толкач, паляк: — Я карэнны жыхар Гродна. Гэты фестываль назіраю ад самага першага свята. Кожны раз бываю на польскім падворку ў Новым замку, і мне гэта падабаецца. Добры фестываль, добры!

Віктар МАЦЮШЭНКА.

НА ЗДЫМКАХ: першы дзень фестывалю: хлеб-соль беларускі, а ў адказ танцы, песні цыганскія, украінскія, малдаўскія, грэчаскія, нямецкія, грузінскія; пачэсным гасцям — пачэснае месца.

Фота Уладзіміра ВАЛЬКО.

беларусы ў свеце

Уладзімір ЮЗВЮК

АЎТАБІЯГРАФІЧНЫЯ ЗАЎВАГІ ДА 75-ГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ

Нарадзіўся ў 1925 годзе ў вёсцы Трысцянка Гайнаўскага павета. Пасля заканчэння беларуска-рускай гімназіі ў Беластоку першыя пяць гадоў быў настаўнікам у роднай вёсцы і завочна канчаў педліцэй у Беластоку. У 1951–1956 гадах закончыў геаграфічны факультэт БДУ, а праз дзесяць гадоў тут жа — аспірантуру. Працаваў 44 гады ў розных установах Беласточчыны: Настаўніцкай студыі, ГП БГКТ, Інстытуце ўдасканалення настаўнікаў — аддзеле ў Беластоку. Атрымаў шматлікія ўзнагароды. З 1991 года на пенсіі.

З дзейнасцю Беларускага грамадскага культурнага таварыства звязаны з пачатку яго існавання. Яшчэ будучы студэнтам, падрыхтаваў у "Ніве" некалькі артыкулаў, пасля быў членам прамыслова-гаспадарчага прадпрыемства БГКТ "Бэтэска", кіраваў працай навуковага гуртка. У 1960–1980 гадах — член ГП, а ў 1960–1969 тройчы выбіраўся яго адказным сакратаром. З 1980 года — член Галоўнай рэвізійнай камісіі БГКТ (1984–1997 гады — яе старшыня). У 2001 годзе адышоў ад спраў.

Звыш пятнаццаці гадоў узначальваю рэвізійную камісію Грамадскага камітэта пабудовы музея і асяродка беларускай культуры ў Гайнаўцы.

Дасягненні апошняга пяцігоддзя: падрыхтоўка ў складаных умовах сямі беларускіх календароў ГП БГКТ і многіх артыкулаў, у тым ліку "Нарыс засялення і загаспадарання Усходняй Беласточчыны", "БГКТ у шасцідзесятыя гады — факты, успаміны", "Людзі БГКТ канца XX стагоддзя", цыкл артыкулаў аб беларускім музеі ў Гайнаўцы і эскізаў да музейнай этнаграфічнай экспазіцыі. Апублікаваныя дагэтуль матэрыялы складаюць каля 70 аўтарскіх аркушаў у кніжных выданнях і шмат газетных матэрыялаў.

Праца на карысць сям'і, беларускіх арганізацый, насельніцтва і рух наперад — асабісты абавязак і гарант добрага самаадчування.

СТАЛАСЦЬ ДУМАК І ЎЧЫНКАЎ

Вядомы на Беласточчыне дзеяч Уладзімір Юзвюк, апрача плённай працы ў дзяржаўных установах Польшчы, амаль 45 гадоў прысвяціў грамадскай дзейнасці ў беларускім таварыстве.

— Спадар Уладзімір, што вызначае дзейнасць таварыства цяпер?

— Не губляю аптымізму. У ходзе выбарчай кампаніі 2001 года з'явіліся новыя энтузіясты дзейнасці, асабліва ў мясцовых гмінах, гарадскіх і павятовых самаўправах, якія ўжо супрацоўнічалі з БГКТ, магчыма, ёсць і спадарожнікі. Лічу, што новыя людзі ўнясуць у арганізацыю новыя формы дзейнасці, а гэта найважнейшае ў будучыні беларускага таварыства.

— Мы памятаем вас на пасадзе адказнага сакратара ГП БГКТ у 1960–1969 гадах, як арганізатара славутай эстрады "Лявоніха", выдавецтва БГКТ, беларускага этнаграфічнага музея ў Белавежжы, аб'язнога кіно і іншых мерапрыемстваў. Не шкада зараз пакідаць таварыства?

— Шкада, але такі "чалавечы лёс", як спявала Ганна Герман.

— Раскажыце крыху аб выдавецкай дзейнасці.

— Гэта тэма шырокая. Ад заснавання пры БГКТ у 1958 годзе навуковага гуртка я марыў аб стварэнні выдавецтва. Такіх магчымасцей тады не было, і ніхто на Беласточчыне гэтым яшчэ не займаўся, можа толькі рэдакцыі газет, у тым ліку "Ніва". Апрацовак нам прыбывала, давялося спалучаць іх з беларускімі календарамі, і такім чынам нараджалася універсальная канцэпцыя кнігі для дарослых і моладзі, сялян і гарадскіх інтэлектуалаў, якая пасля крыху ўдасканальвалася, але праіснавала да цяперашняга часу. Беларускія календары БГКТ — гэта ўжо скарбніца ведаў аб Беласточчыне і не толькі аб ёй.

Менш вядомы чытачам мой перыяд выдавецкай дзейнасці на польскай мове для настаўнікаў як кіраўніка выдавецтва Інстытута ўдасканалення настаўнікаў — аддзела ў Беластоку, як аўтара некалькіх брашур, сямі аркушаў артыкулаў і сааўтарства ў метадычных выданнях.

А ў 1993 годзе абставіны проста ўцягнулі мяне ў падрыхтоўку беларускіх календароў на 1994, 1996–2002 гады. Пяць першых з іх падрыхтаваны сумесна з выдавецтвам "Беларусь" у Мінску пры фінансавай дапамозе Міністэрства культуры, Дзяржкамдруку, упамянутага выдавецтва і нястомнай працы яго вядучага рэдактара Галіны Пармон. Апошнія календары выдаваліся ўжо ў Беластоку (Ортдрук).

Былі гэта 200–300-старонкавыя кніжныя, добра ілюстраваныя выданні, якія змяшчалі каляндарную частку, весткі з жыцця БГКТ, водгукі аб мінуўшчыне і сучаснасці Беласточчыны, этнаграфічныя і літаратурныя матэрыялы.

— А якія вашы ўласныя выдавецкія дасягненні?

— Мае сталыя працяглыя прафесійныя абавязкі і іншыя заняткі не далі магчымасці рэгулярна займацца даследчай працай. Усё ж у кніжных выданнях на беларускай, польскай і рускай мовах выйшла каля 70 аўтарскіх аркушаў апрацовак, каля 100 артыкулаў у тыднёвіку "Ніва" і некалькі ў "Голасе Радзімы", чытачом якога з'яўляюся.

Быў я складальнікам дзесяці беларускіх календароў БГКТ і членам многіх рэдакцыйных калегій.

— Які ваш погляд на будаўніцтва з 1985 года Музея і асяродка беларускай культуры ў Гайнаўцы?

— Сумна, што будаўніцтва аб'екта працягвалася доўга. Але ў гэтым віна не грамадскага камітэта, які ім займаўся, і не мая, як нязменнага старшыні яго Рэвізійнай камісіі, а грамадскіх абставін у нашай краіне. Трапілі мы на перыяд польскай трансфармацыі сацыялізму ў капіталізм дзяржаўна-каператыўных устаноў і нават вядомых у краіне і за яе межамі цэлых галін гаспадаркі, у тым ліку беластоцкай тэкстыльнай і дрэваапрацоўчай прамысловасці, электронікі, не гаворачы пра сотні клубаў, бібліятэк і г.д. Наша грамадскасць абяднела. Не хапала крыніц пастаяннага фінансавання будаўніцтва, але, пераадольваючы ўсе цяжкасці, яго ўжо закончылі.

Па тых жа прычынах марудна ідзе арганізацыя сталых экспазіцый. Мне давялося папрацаваць над іх сцэнарыямі. Не ўпэўнены, што яны будуць узяты пад увагу, таму што няма вопытнага каардынатара ўсіх работ.

— Апошняе пытанне. Вы двойчы апублікавалі ў "Ніве" вынікі сваіх падлікаў беларускага насельніцтва на Беласточчыне. У 1967 годзе атрымалася 376 тысяч, а праз 20 гадоў — 356 тысяч. БГКТ ж аб'явіла лічбу "каля 200 тысяч", а іншыя ўстановы — яшчэ меншую. Вельмі вялікія разыходжанні. Сёлета ў маі праведзены перапіс насельніцтва з улікам нацыянальнай прыналежнасці і веравызнання ўсіх грамадзян Польшчы. Якіх чакаеце вынікаў?

— Чакаю афіцыйных катастрафічных вынікаў, якія будуць яшчэ менш праўдзівыя, па маіх прыблізных падліках. У нашым штодзённым жыцці і нацыянальнай свядомасці нічога яны не зменяць. Колькасна перамогуць хамелеоны, якія захавалі ў памяці пасляваенныя пагрозы эвакуацыі, прысуды смерці АК і іншых падпольных груповак, нейкія крыўды пазнейшай пары, а можа ўсяго толькі незычлівасць часткі польскага насельніцтва. Яны ўслед за публікацыямі гора-даследчыкаў і часткі праваслаўнага кліра, пададуць ілжывыя даныя "праваслаўны паляк", архаізм тутэйшы, а можа нават зараз так упадабаны ўладамі "ўкраінец". Чаго можна чакаць, калі выхадзец з нашага народа, прафесар, у публікацыі 2001 года піша, што "...можна адначасова быць літвінам і палякам, жыдам і палякам, беларусам і палякам". Ці не пераблытаў ён нацыянальнасць з грамадзянствам (падвоеным!). І ці прызнаюць гэтых падвоеных палякі? Праз месяц усе яны могуць зрабіцца сербамі, палесцінцамі...

Не ведаю, як на гэты раз адзавецца вясковае насельніцтва Бельшчыны, якое ў перапісе 1946 года выказала вельмі высокую нацыянальную свядомасць, ці Сакольшчына і левабярэжжа Буга. Пэўнасць маю, што жыхары Беластока выкажуць найвялікшую няпраўду, бо правільна акрэсліць сваю нацыянальнасць адважыцца ўсяго нейкая тысячная частка, а больш праўдзіва — веравызнанне.

У маіх падліках усё было спрошчана, без улікаў ступені нацыянальнай свядомасці. Зыходзіў з таго, што паміж дзяржаўнай граніцай з Беларуссю і этнічнай мяжой Е.Ярашэвіча з 1848 года (глядзі: Obraz Litvy, s, 206) пражываюць беларусы і польскія мігранты, скопішчы якіх вядомыя ў вясковых асяроддзях, а для гарадоў існуюць "шацункі". Лік насельніцтва ў паасобных адміністрацыйных адзінках змешчаны ў статыстычных гадавінах, трэба толькі падлічыць, і гэта было зроблена.

Аб выніках перапісу, якія будуць вядомыя ў канцы года, баюся нават думаць, асабліва ўлічваючы адносіны да нас дзяржаўных і ваяводскіх улад.

— Дзякуй за гутарку, жадаем добрага здароўя.

Віктар БУРА.

мінск, захарава, 28. дом дружбы

Андрыс ВЕЯНС

ЯНКА КУПАЛА Ў РЫЗЕ

Даўгава, пэўна ж, ты
ведала-знала:
Дзе тут спыняўся Янка Купала?

— Тут вось, ля моста,
добра я знаю, —
Думаў пра лёс
беларускага краю.

Ліпы, што скажаце вы мне
пра гэта?
Сонца спявала ў зрэнках паэта?

— Пэўна ж, бо сам ён ад промняў
прадвесніх
Полымя ўліў у змагарныя песні.

Вецер, скажы мне, браток
незаспаны:
Як усміхаўся Янка Купала?

— Светлы паэт меў вялікую
службу:
Славіў ад сэрца ён шчырую
дружбу.

Чара бяседы, ты тост уздымала:
Што гаварыў там Янка Купала?

— Лепшыя словы — лепшыя лекі:
"Разам жыць будзем! Разам —
навекі!"

З латышскай мовы пераклаў
Сяргей ПАНІЗНІК.

У ЗАЛАТОЙ ЛІСТОЦЕ НА ВЫСОКАЙ ГАРЫ

АНДРЫСУ ВЕЯНСУ — 75

Аднаго разу давялося слухаць, як Донат – сын Гераніма з латгальскага роду Калначаў спяваў песню свайго бацькі. Толькі некалькі слоў розніліся ў вымаўленні ад нашага сучаснага літаратурнага слоўніка. Латгальска-крывіцкае сумежжа сотнямі добрасуседскіх гадоў пранікласа дыфузіяй мовы, душ, меласу. І паэту Андрысу Веянсу (псеўданім Даната Калнача) лёгка было шукаць адпаведнікі купалаўскім словам, ствараць "Дрысвяцкія замалёўкі", мацаць "Залацістае лісце на высокай гары" і ўкладаць шчымлівыя пачуцці сабрыса ў пераствораныя ім радкі балткрэваў П.Панчанкі, Якуба Коласа, П.Броўкі, Максіма Танка, П.Пестрака, Р.Барадуліна, В.Вітакі, А.Зарыцкага, К.Кірэенкі, С.Шушкевіча...

А нарадзіўся Донат сын Гераніма пад Лудзаю 20 красавіка 1927 года. Скончыў Рыжскі педагагічны інстытут, дзе выкладаў латвійскі беларус Уладзімір Пігулеўскі. Ці не ён і стаў першым настаўнікам будучага перакладчыка Андрыса Веянса...

У залатой лістоце гадоў нашага творцы высокія званні і заслугі не толькі за літаратурную дзейнасць, але і нястомную грамадскую работу. Не так даўно здзейсніў Андрыс Веянс чынны зямляцкі подзвіг: уклаў вялікую анталогію латгальскай паэзіі. А мы памятаем яго падарунак дзесяцігадовай даўнасці. Разам з Віктарам Ліўзэмніскам ён пераклаў на латышскую мову томік Максіма Багдановіча "Цвяток радзімы васілька..." Кніга атрымалася двухмоўнай, з паралельнымі тэкстамі. Дапамог з'яўленню на свет такога неардынарнага выдання Рыгор Барадулін. Андрыс Веянс у прадмове пісаў: "Мы з Беларуссю, з беларусамі, нашымі паўднёва-ўсходнімі суседзямі, у блізкіх і далёкіх стагоддзях мелі многа агульных бедаў, цяжкіх патрасенняў, чорных дзён роспачы і светлых хвілін надзеі".

Светлую хвіліну роднасці, сваяцкай пяшчоты даў нам адчуць, яшчэ раз перажыць багаты на духоўныя скарбы Андрыс Веянс са сваёй юбілейнай нагодай. Яго лагодныя вочы, прыязная ўсмешка, добразычлівыя словы вяртаюцца ў памяць заўсёды, калі мне згадваецца чароўнае імя радзімы Андрыса Веянса — Лат-га-ле. Мне выгадна: прыеду на сваю бацькаўшчыну, на дрысадруйскую Дзвіну-Даўгаву і разам з плытагонным рэхам адпраўлю Веянсу сяброўскае "Свэйкі!" — мой шчыры добры дзень.

— Laimigu cēlu!

("Шчаслівай дарогі!") сыну Гераніма.

Сяргей ПАНІЗНІК,

старшыня рады таварыства "Беларусь—Літва".

родны краявід



Фота БелТА.

Сафійскі сабор у Полацку.

літаратурная старонка

ДАКРАНАННЕ ДА НАРОДНАГА

Чытачы "Голасу Радзімы" маюць магчымасць пазнаёміцца з драматычным абразком слыннай беларускай паэтэсы Наталлі Арсенневай, які не друкаваўся ні ў ранейшых кніжных выданнях, ні ў нядаўна выдадзеным "Беларускім кнігазборам" салідным томе выбраных твораў, дзе, мяркую, ён быў бы зусім не лішнім. Невялікі памерам, твор гэты, аднак, яскрава сведчыць аб шырыні творчых магчымасцей аўтаркі, якую з поўнай падставай можна назваць "паэтам чыстай красы", адным з найбольш тонкіх і дасканалых беларускіх лірыкаў, надзвычай меладычным, элегійна-прасветленым, духоўна-ўзвышаным. А тут яна нібы пакідае "высокае неба ідэалу" (выраз Анатоля Вярцінскага) і апускаецца на "грэшную" зямлю, каларытна, праўдзіва, у набліжанай да фальклорнай стыхіі форме апісвае папулярны ў беларускай драматургіі эпізод сватаўства, малюе тыповую для дарэвалюцыйнай і заходнебеларускай рэчаіснасці сітуацыю выбару маладымі людзьмі свайго лёсу, калі паўстае дылема захаваць вернасць чыстаму і ўзнёсламу юнацкаму каханню ці выйсці замуж за нялюбага, але багатага, а ў гэтым выпадку яшчэ і недацёпістага, нягеглага. Пра тое, што падобны сюжэт, таленавіта ўвасоблены, меў моцную жыццёвую закваску і запатрабаванасць гледача, найбольш яскрава сведчыць сцэнічны лёс неўміручай Купалавай "Паўлінкі", якою і дасюль першая тэатральная сцэна краіны (Нацыянальны тэатр імя Янкі Купалы) кожную восень пачынае свой чарговы тэатральны сезон...

Што датычыць "Сватоў" Н.Арсенневай, то яны, безумоўна, прызначаліся не для прафесійнай, а дзеля аматарскай сцэны. Магчыма, абразок быў напісаны яшчэ ў заходнебеларускі перыяд, магчыма, у вайну, але, хутчэй за ўсё, у пасляваенны перыяд, у эміграцыі, калі існавала шмат самадзейных мастацкіх калектываў, у тым ліку і тэатральных, і была патрэба вось у такіх немудрагелістых па сюжэце сцэнках, лёгкіх для пастаноўкі, але настальгічна беларускіх, прасякнутых жывым народным гумарам, трапным беларускім словам, з вобразамі простых людзей з народа.

На вокладцы асобніка, які маю, пазначана З.Б.М. (гэта значыць, Згуртаванне, ці Задзіночанне беларускай моладзі) у Амэрыцы, пад грыфам якой гэтая п'еска выдавалася простым друкарскім спосабам, напэўна, у невялікай колькасці, магчыма, усяго некалькі штук для надзённых патрэб. Адзін з іх і падарыў мне светлай памяці Сяргей Карніловіч пасля таго, як мы пабывалі ў паэткі і вярнуліся з-пад Ніягары назад у Кліўленд. Гэта была незабыўная сустрэча з амаль што легендарнай асобай, якая на сваім жыццёвым шляху працягам больш чым дзевяноста гадоў зведала і згрызоты, і трагічныя ўдары лёсу, але засталася душэўна прасветленай, розумам мудрай і памятлівай, учэпістай на дэталі. Яна падрыхтавала нам шыкоўны пачастунак, выявіўшы яшчэ адзін талент – завадовага кухара. А ў гародчыку, таксама дагледжаным яе працавітымі рукамі, палымнелі вялізныя, у два кулакі, памідоры, раскошныя, экзатычныя для мяне, амерыканскія, і нашы, па-тутэйшаму родныя кветкі...

Зразумела, каб абразок "Сваты" выплыў з Сяргеевага абшырнага кнігазбору не пасля, а да нашага наведвання шаноўнай пісьменніцы, то пытанні, пастаўленыя вышэй, былі б зняты пры той незабыўнай сустрэчы. Цяпер жа даводзіцца толькі спадзявацца, што, магчыма, знойдуцца ў эміграцыі людзі, якія здолеюць згадаць цікавыя дэталі і падрабязнасці ці хоць бы факты, звязаныя з напісаннем і верагодным сцэнічным жыццём "Сватоў", якія, мяркую, з'яўляюцца не толькі фактам гісторыі літаратуры, але могуць быць увасобленымі і ў сучаснай тэатральнай дзеі.

Яўген ЛЕЦКА.

Наталля АРСЕННЕВА

СВАТЫ

Асобы:

Гануля — прыгожая вясковая дзяўчына.

Антось — спрытны, удалы дзяцюк.

Дзед Ганулі.

Бацька Ганулі.

Маці Ганулі.

Сват — гаваркі мужчына.

Сцяпан — няспрытны багаты дзяцюк.

Зоська — сяброўка Ганулі.

Хлопцы, дзяўчаты і музыкі.

Хата заможнага селяніна. Уздоўж сцен лавы, у куце, пад абразамі, стол. Печ, за печчу дрэмле дзед. На лаве пад акном сумна сядзіць Гануля. Калядны вечар. За акном ідзе снег.

Гануля. Так неяк ціха, сумна сёння ў хаце. Ніхто не зойдзе. Мо дзяўчаты куды на ігрышча збіраюцца? Мо і Антось з імі *(уздыхае, памаўчаўшы крыху)*. Ці кахае ён мяне хоць крышачку? Часам здаецца, што любіць, бо ён так дзіўна глядзіць на мяне, ажно вочы яго свецяцца, як дзве зоркі. Дзе я — там і яны. А часам зноў здаецца мне, што ён мяне ані-ані не кахае, што ён злуе на мяне. *(Устае.)* Але навошта я аб гэтым думаю? І так з нашага кахання нічога не будзе. Мяне ж не аддадуць за яго, бо ён батрак, а я — багачка. *(Заглядае ў акно.)* Як цёмна... Вецер... Мяцеліца... *(Пяе.)*

Не куры, не вей, мяцеліца сівая.
Маё сэрца й так журба залівае.
Не знайду сабе ні месца, ні
працы,
Неахота ні гуляць мне,
ні смяяцца.
Сумна мне, што сівер крышыць
вецце,
Сумна мне, што сонейка
не свеціць,
Сумна мне, што знаю я й
не знаю,
Ці мяне каханы мой кахае...

(Прытуляецца тварам да шыбы.)

Антось *(ціха ўваходзіць у хату)*. Гануля!

Гануля *(спалоханая адварочваецца)*. Антось... А я думала...

Антось. Што ты думала?

Гануля. Я думала...

Антось *(горача)*. Гануля, хай будзе, што будзе, але не магу я больш маўчаць! Гануля, няўжо ж ты не бачыш? Я ж кахаю цябе, даўно кахаю!

Гануля *(адступаючы)*. Антось...

Антось. Чаму ты не глядзіш на мяне? *(Бярэ яе за руку.)* Ну скажы хоць слоўка.

Гануля. А што сказаць?

Антось. Што? Скажы, ці любы я табе хоць крышачку?

Гануля *(ціха)*. А ты не бачыш?

Антось *(радасна)*. Дык гэта праўда, дык ты мяне кахаеш? Ну скажы, любая мая, зорачка мая, не бойся, скажы.

Гануля *(яшчэ ціхай)*. Але...

Антось *(абдымае яе)*. Дык хочаш быць маёй?

Гануля *(прымае яго рукі)*. Хто ж табе аддасць мяне?

Антось. Хто? А я сам вазьму! *(Хоча пацалаваць.)*

Дзед *(кашляе за печчу, Антось адскоквае ад Ганулі)*. Кхэ, кхэ, кхэ. А хто там, ці не ты, Антось?

Антось. Я, дзеду.

Дзед. Ты адзін там?

Гануля. І я тут, дзядуля.

Дзед. А, і ты тут... Ну, тады не дзіва, што і Антось да нашай лавы прыкіпеў... Ха, ха, ха. *(Смяецца, аж закашляўся. Антось у гэты час шэпчацца з Ганулай, а тады бярэ яе за руку і цягне да дзеда.)*

Антось. Дзед Міхась, а, дзед Міхась... Мы маем да цябе просьбу... Ты стары, шмат жыў на свеце, шмат бачыў... Ты ўсё разумееш... Дапамажы нам!

Гануля *(кідаецца, абдымае дзеда)*. Дапамажы нам, дзядуля, папрасі за нас тату ды маму. Дзядуля, родненькі!

Дзед *(робіць выгляд, што не разумее)*. Папрасі... Дапамажы... Але ў чым? Чаго вы хочаце? Нешта не ўцямлю.

Антось. Дапамажы, каб Ганульку мне аддалі.

Гануля. Папрасі, каб тата і мама за Антося аддалі.

Дзед *(весела)*. А, вунь чаго вам захацелася... Ну і свет цяпер пайшоў... Ледзь дзеўка ад зямлі адрасла, а ўжо *(перадражнівае)* "каб тата і мама за Антося аддалі". Замуж просіцца!

Гануля. Не смейся, дзядуля, які ты!.. Але па праўдзе, папрасі тату і маму, бо *(рашуча)*, калі не за Антося, то я ніколі ні за кога замуж не пайду!

Дзед *(смяецца)*. Вось напалохала! Бачыш якая.

Антось. Дзядуля, будзь добры. Я ж таксама нікога іншага, апрача яе, ніколі не вазьму. Вось, каб мне з гэтага месца не сысці, не вазьму!

Дзед. Ой, дзеці, вы, дзеці *(смяецца)*. Ну добра ўжо, добра, паспрабую, хоць справа нялёгкая. Ты ж ні палацаў, ні валокаў не маеш, хлопча, а з грашыма і таго горш!

Антось. Нічога, дзеду! *(Выцягвае рукі.)* Глянь, рукі мае моцныя, як пастронкі, грудзі шырокія! Няўжо ж я нарэшце не знайду свае долі?! А яшчэ як Гануля са мной будзе! Не знойдзем тут шчасця — паедзем у шырокі свет!

Дзед. Эх, сынку, горкі хлеб з чужых, не нашых ніваў. Не дай, Божа, пакаштаваць яго...

Гануля. Не бойся, дзеду, за нас... Толькі дапамажы нам *(туліцца да яго)*. Дапамажаш, праўда? Папросіш тату і маму, так? Дзядуля, родненькі мой, залаценькі! *(На вуліцы чуваць смех і спевы. Спяваюць калядкі. Спеў набліжаецца, затрымліваецца ля хаты, чуваць тупат у сенцах, а тады адчыняюцца дзверы, і ў хату ўбягаюць дзяўчаты і хлопцы, спяваюць: "Ой, Калядачкі, бліналадачкі". Гануля і Антось ідуць ім насустрач.)*

Усе. Вечар добры ў хату!

Гануля *(весела)*. Хадзіце, дзяўчаткі, хадзіце! *(Дапамагае скінуць ім хусткі і кажушкі.)*

Хлопцы. А нас не просіць?

Зоська. Вас і прасіць не трэба, вы, як тая крапіва пад плотам, не сеяўшы, вырасцеце. *(Усе смяюцца. Моладзь садзіцца хто куды на лавах і пачынае зноў спяваць калядкі, жартаваць і смяяцца.)*

Зоська. Ведаеце што, давайце скакаць, а мо пагуляем у што?

Усе. Добра, пагуляем! *(Пачынаюць гуляць у жмуркі. У самы разгар вясёлай гульні адчыняюцца дзверы і ў хату ўваходзяць нечым усхваляваныя Гануліны бацькі. Бацька з ліхтаром, а маці з дайніцаю. Яны былі ў хляве, парадкавалі скаціну.)*

Бацька. Э, ды, я бачу, у вас весела!

Маці. Божухна мой! Дачушка! У хаце пыл, непарадак, стол не засланы! *(Мітусіцца па хаце, пакінуўшы дайніцу ля парога.)* Гануля, Ганка, ідзі ў камору хутчэй!

Гануля. А чаго?

Маці. Сваты едуць! *(Прыслухоўваецца.)* Божухна мой, ужо прыехалі, на двары чуваць! Зараз у хату ўвойдуць! *(Пад акном чуюцца званочкі, пачынаецца мітусня. Бацька хутка ідзе да лавы, скідае кажушок і пачынае корпацца ў скрынцы, што стаіць пад лавай. Маці кідаецца абціраць стол і лавы. Гануля ўцякае за печ, Антось памыкаецца за ёю, але застаецца сярод хаты. Хлопцы і дзяўчаты збіваюцца ў кучку. У дзверы стукаюць. Усе маўчаць. Стук паўтараецца.)*

Бацька. Просім! *(У хату ўваходзіць нязграбны дзяцюк са сватам-дзядзькам, абодва ў кажухах і бурках.)*

Малады *(Сцяпан)* **і сват.** Добры вечар, добрыя людзі!

Бацька і маці *(не падымаючы галавы)*. Добры вечар! *(Маўчанне, сват і малады тупаюць ля парога. Зоська неспакойна круціцца на лаве, стрымліваючы смех. Сустрэўшы яе погляд, Сцяпан робіць крок наперад, але натыкаецца на дайніцу і падае, вядро са звонам перакульваецца, і малако аблівае Сцяпана. Ён нязграбна ўстае, расставіўшы рукі ў рукавіцах, з якіх капае малако. Дзяўчаты пачынаюць рагатаць, але праз сілу стрымліваюцца.)*

Сцяпан. І хто гэта пад парогам вядро паставіў, каб ён так век пад парогам стаяў! *(Сват торкае ў бок.)* Ах, прабачце, я не гэта сказаць хацеў *(да свата)*. Што гэта я сказаць меў? *(Сват ізноў торкае яго ў бок.)*

Сват. Даруйце, людзі добрыя. Са двара, па поцемку не разгледзеў дзяцюк. Мала чаго ў жыцці не бывае. *(Маўчанне.)* Вось ехалі мы ля крыніцы, напаткалі куніцу, мы за куніцаю ў лясок, мы за куніцаю ў верасок, па ельнічку, па бярэзнічку, ажно заблудзіліся. *(Да Сцяпана.)* Ці ж не?

Сцяпан. Не, мы не блудзілі, мы проста ехалі. *(Сват торкае яго ў бок.)* А так, так... *(прыпамінае завучанае дома)*. Аж тут і звечарэла...

Сват. Дазвольце, людзі добрыя, паначаваць ды тавару вашага патаргаваць.

Бацька *(седзячы, як раней)*. Тавару? *(Ветлівей.)* Сядайце, людцы, сядайце, гасцямі будзеце.

Сват. Дзякуй, у хаце сядзелі...

Сцяпан *(гучным шэптам)*. Як сядзелі? Я ж увесь дзень, як загізаваўшы, лятаў. І ў шаўца быў, і ў кузні, і па гарэлку... *(сват торкае яго ў бок)*.

Сват. Так, у хаце сядзелі, а тавару не паглядзелі.

Бацька. Чаго ж шукаеце, людзі добрыя?

Сват. Шукаем мы тую кветку, што цвіце і ўзімку, і ўлетку. А я на тое прысланы, каб быў стол заслана *(пры гэтым гаспадар устае і ветліва звяртаецца да гасцей)*.

Бацька. Прашу сядаць, людзі добрыя! За стол, сюды, калі ласка! *(Сват вядзе маладога за стол, госці збольшага распранаюцца. Сцяпан аніяк не сцягне з сябе кажуха, чырванее і ледзь не душыцца.)*

Зоська *(ціха да дзяўчат)*. Глядзіце, дзяўчаткі, на маладога, надзьмуўся, як пухір, вось-вось лопне.

Сцяпан *(пачуўшы)*. Ну і язык! Гэтыя бабы — ажаніцца і то чалавеку спакойна не дадуць! *(Дзяўчаты смяюцца, сват торкае маладога ў бок, і госці нарэшце садзяцца на покуці).*

Сват. Ну дык як? Ці знойдзем мы ў вас тую кветку, што красуе і ўзімку, і ўлетку?

Бацька. Штось не ўцямлю, якая гэта кветка? *(Тым часам маці засцілае стол чыстым абрусам. Сват вымае з кішэні хустачку, рассцілае яе на стале, кладзе акраец хлеба і ставіць пляшку гарэлкі.)*

Бацька. Гм... Кажаце, кветка... *(бярэ за руку Зоську, хоць тая ўпіраецца, і цягне да гасцей)*. Мо гэта красачка вам трэба?

Сват. Не, не гэта.

Сцяпан *(усміхаючыся)*. Чаму? Я б і гэтую ўзяў! *(Смех, сват торкае маладога злосна ў бок.)*

Зоська *(з робленай пагардай)*. Смачны жабе гарох.

Бацька *(бярэ за руку іншую дзяўчыну)*. А мо гэтая вам даспадобы?

Сват. Не, не гэтая!

Бацька *(ідзе за печ і прыводзіць Ганулю, якая ўпіраецца і адварочваецца)*. А мо гэтая?

Сват і Сцяпан. Але, але, гэтая!

Маці. Ды навошта вам яна?

Сват. А ёсць тут у мяне агароднічак,

Ён яе паліваць будзе.

Ён яе даглядаць будзе *(паказвае на маладога)*.

Сцяпан *(радасна)*. Даглядаць буду, цалаваць буду! *(Сват торкае яго ў бок, і ён замаўкае, ухмыляючыся.)*

Дзяўчаты. Ды ці ж ён патрапіць?

Зоська. Такі лупаты...

Сцяпан *(падміргвае публіцы)*. Ізноў чэпіцца, відаць, закахалася не на жарт! *(Горда выпроставае плечы і задзірае галаву.)*

Зоська *(ціха)*. Боўдзіла!

Сват *(выходзіць на сярэдзіну хаты, з абурэннем)*. Што, Сцяпан мой не патрапіць!? *(Выхваляючыся.)*

Ён — гаспадар у хаце!
А хата ў яго, хата! — усім
багата!
У садку у нас, ці чулі? —
Па пуду дулі.
Гурочкі ў агародзе — дык па
калодзе!
А пчолы нашы, пчолы —
маўляў, саколы!
За дзень назносяць мёду, як лёду!
Авечкі ў нас, як коні;
каноплі, як сасоннік!
А ўсяго ж чыста многа, от,
дзякуй Богу!

Сцяпан *(аж заходзіцца ад задавальнення)*. Так, хі, хі, хі, далібог, так!

Сват *(торкае яго ў бок і працягвае далей)*.

Заканчэнне на 8-й стар.

жыццёвыя сюжэты

Фота БелТА.

ЛІМОН ПРЫЖЫЎСЯ НА ПАЛЕССІ

Небывалых памераў пакаёвы лімон вырасціла ў сябе на акне Тамара ПАЛЬЦАВА з пасёлка Акцябрскі Гомельскай вобласці. Плод вагой 560 грамаў ужо трэці па ліку. Першыя два былі крыху меншай вагі — па паўкілаграма.

Тамара Пальцава 36 гадоў займаецца вырошчваннем розных кветак, толькі руж у яе садзе больш за 40 кустоў.

занатоўкі з натуры

ПРА СМЕРЦЬ

Хадзілі з маці даіць кароў. Я ёй дапамагаю несці вядзерца з малаком. Сонца высока над галавой. Поўдзень. Стаім на кручы. Унізе блішчыць Дняпро. Хмызняк і дрэвы адбіваюцца ў вадзе, застылі, нават не відаць цячэння. Рэдкія воблакі глядзяцца ў раку, як у люстэрка. Статак прыйшоў на стойла, каровы зайшлі ў ваду, схаваліся ад сляпнёў, толькі мокрымі хвастамі лупцуюць сябе па баках, а большасць ляжыць на гарачым пяску.

Маці гаворыць: " Якая прыгажосць! Як чалавек памірае, калі вакол так прыгожа?" Я ёй гавару: "А хіба восень не прыгожая пара?" Яна адказвае, што няма нічога прыгажэй, чым восень. Таксама нельга паміраць у такі час. "А ўзімку?" — пытаю я. "Цудоўная пара! Толькі зімой убачыш іней на дрэвах, як карункі нехта зрабіў. Рака замярзае! А ледзяшы, калі адліга, — хіба гэта не цуд?! Не, у такі час таксама паміраць нельга". Ну а вясной, калі ўсё прачынаецца, бягуць раўчукі, паводка на рацэ, першыя лісточкі, усё цвіце, спяваюць птушкі — як тут памерці?

Чалавеку дадзена шчасце, каб жыць сярод прыроды. Адчуваць сябе чалавекам не толькі, калі працуеш, а яшчэ, калі бачыш хараство, якое вакол цябе. Прыйдзе час, усе пойдуць у іншы свет. Можа на тым свеце яшчэ прыгажэй, чым тут, але ніхто адтуль не прыйшоў і не сказаў, як там на самай справе. А ў нас тут сапраўдны рай.

Ігнат СТУДЗЕНЬ.

Малюнак Вячаслава ІГНАЦЁНКІ.

літаратурная старонка

Наталля АРСЕННЕВА

СВАТЫ

Пачатак на 7-й стар.

А малады разважны, разумны
і адважны. (Да публікі.)
З ваўком, дасць Бог, сустрэцца —
дык нат не скаланецца.
Чорта спаткае ўночы —
нават не апусціць вочы!
Вось, які наш малады!
(Выцірае лоб і садзіцца).

Маці *(ставіць на стол закуску і чаркі)*. Калі ласка, перакусіце трошкі! *(Ідзе за печ да дзеда, які ўвесь час моўчкі сядзіць там.)* Тата, хадзіце і вы за стол чарку выпіць!

Дзед. Не ласы я на чужыя чаркі...

Маці *(пастаяўшы, ідзе зноў да стала)*. Налівайце чаркі, бацька. *(Сцяпан ласа ўглядаецца на закуску, аж сват зноў змушаны торкаць яго ў бок.)*

Сват *(памаўчаўшы)*. Ну, дык як жа будзе?

Маці. А гэта, як дачушка скажа.

Бацька. Няволіць не будзем. *(Гануля стаіць, адвярнуўшыся да сцяны, і маўчыць, кідаючы час ад часу погляд на Антося, які нервова круціцца сярод моладзі, памыкаючыся разпораз сказаць нешта Ганулі, і нарэшце падыходзіць да яе.)*

Антось. Гануля, Гануля, скажы, скажы ім, бо я скажу!

Гануля. Ціха, ціха, маўчы, чакай!

Сват. Ну, дык як? *(Малады вылазіць з-за стала і ідзе да Ганулі, хоча абняць яе.)*

Сцяпан. Гануля, не саромейся, скажы, што ты пойдзеш за мяне! *(Гануля ўхіляецца.)*

Сват. Не чурайся яго, красачка. *(Да маладога.)* Ну-ну, смялей, смялей, Сцяпанка, а то яшчэ людзі падумаюць, што ты дзевак баішся!

Сцяпан. Я дзевак баюся? Ды я, ды я... Я нічога не баюся: ні ведзьмакоў, ні ваўкалакаў! Хай сюды сам чорт прыйдзе, я яму такое пакажу... *(Антось выходзіць з хаты, паклікаўшы за сабой пару хлопцаў.)*

Сват. Дык як, суседзе, п'ём барыш?

Бацька і маці. Хай сама кажа.

Гануля *(убачыўшы, што Антось выйшаў, паварочваецца ад сцяны і сумна гаворыць):*
Ды цераз мой двор, ды цераз
мой двор,
Цяцера ляцела.
Ды не даў мне Бог, не судзіў
мне Бог,
Каго я хацела.
З кім я стаяла, размаўляла,
Месячык вітала.
З каго кпіла, смяялася,
Сама таму дасталася.

Сцяпан *(з расчараваннем)*. Кпіла? Як жа так? *(Да свата.)* А дзядзька ж казаў, яна за мной аж пішчыць!

Сват. І пішчыць, і пішчыць, а кпіны дзявочыя — гэта тыя ж любашчы! Ці ж не так, дзеўкі? *(Смех. У гэты час у сенцах раздаецца страшэнны грукат і ў хату ўрываюцца некалькі хлопцаў, пераапранутыя смерцю, чарцямі і г.д. Смерць і чэрці падскокваюць да маладога і бяруць пад рукі. Дзяўчаты пішчаць і разбягаюцца. Гануля стаіць, не ведаючы, што рабіць. На крык з-за печы выходзіць дзед.)*

Смерць і чэрці. Бяры яго, цягні яго, вось так! Вось так! *(Сцяпан з крыкам кідаецца пад стол, сват прысядае пад лавай, пачынаецца страшэнны гармідар.)*

Сцяпан. Сватка, братка, ратуй мяне!

Сват *(з-пад лавы)*. Божачка, ратуй!

(Антось скідае посцілку і кідае касу.).

Зося. Дзяўчаткі, гэта ж Антось!

Сцяпан *(устае, яшчэ ўвесь калоціцца)*. А я так і ведаў і ані не спалохаўся. Чаго тут палохацца? *(Да свата ціха.)* Дзядзечка, хай яго з жаніцьбай, едзем лепш дадому.

Бацька *(да свата)*. Даруйце... *(чухае патыліцу)*. Пажартавалі дзецюкі, вядома, Каляды, дык гулі ў галаве.

Маці. А Божухна! Знайшлі час, нягоднікі!

Сват *(злосна)*. Дзякую гаспадарам за гасцяванне, за ветлае вітанне! *(Штурхае ў бок Сцяпана.)* Кланяйся і ты, дзякуй! *(Да гаспадароў.)* Кпіны з нас строіць надумалі, людцы мае? Не, гэтага мы вам не даруем!

Сцяпан. Не даруем, не даруем!

Сват. Яшчэ папомніце нас!

Сцяпан *(адыходзячы да дзвярэй)*. Папомніце нас!

Сват. Каб вы спухлі, каб вы спруцянелі!

Сцяпан *(паўтарае)*. Каб вы... Каб вы... Каб вы *(бразнуўшы дзвярыма, выходзяць. Маўчанне).*

Бацька *(строга)*. Што гэта ты, Антось, надумаў?

Зоська *(смеючыся)*. Ну і адважны малады! Не баіцца чорта, Антося спужаўся!

Гануля *(не зважаючы на людзей, кідаецца Антосю на шыю)*. Антось!

Бацькі *(з абурэннем)*. Ганна!

Дзед. Гануля!

Бацька *(да Антося)*. А ты, гіцаль, вон з хаты!

Маці *(плачучы)*. Сватоў прагналі, гэткі сорам, гэткі сорам, што цяпер людзі скажуць?!

Антось *(абдымаючы Ганулю)*. Вось я Ганулі нікому не дам!

Гануля. І я за іншага не пайду!

Бацька. Не-не, ніколі! *(Да Антося.)* Ідзі і не прыходзь больш!

Дзед *(выходзячы наперад)*. Пачакайце, не можна ж так, у чым дзяцюк вінаваты, што Ганначку нашу ўпадабаў? А што пажартаваў, дык маладое — дурное. А ажэніцца — пасталее. З гэтымі сватамі і добра, што так сталася, хоць і багаты Сцяпан, а дурны, як бот.

Антось і Гануля *(кідаюцца да бацькоў і цалуюць іх у рукі)*. Татуля, мамачка, не разлучайце нас!

Антось. Я працаваць буду, Ганулі ў мяне добра будзе!

Гануля. А хай і блага, але з табой!

Дзед. Не ў багацці шчасце. А дзяцюк з Антося добры, рахманы, працавіты. Як на мяне, хай бы браў Ганульку.

Гануля *(плача)*. Татачка, матулька, родненькія!

Маці *(сама плачучы)*. Не плач, дачушка, я што, я... Каб табе было, як найлепш. Ты ж адна ў мяне.

Бацька. Вось табе і новыя сваты!

Дзед. Ну як? Благаславім ці што?

Бацька *(да публікі)*. Ну як, благаславіць хіба?

Усе. Благаславіць, благаславіць! *(Бацькі благаслаўляюць маладых. У гэты час у хату ўваходзяць яшчэ хлопцы з музыкай. Спачатку іграюць беларускія мелодыі, а пасля народны танец "Бульбу". Усе пяюць тое ж самае, а пасля пачынаюць скакаць польку. У першай пары Антось з Ганулай. Дзед і бацькі спагадліва і весела пераглядваюцца. Пачынаецца вялікая гульня. У самы прыгожы момант заслона закрываецца).*

Канец.

А Ў БАРЫ!

Тудою ішлі
Тры жаўнерыкі.
Гэй, гэй, гэй!
Тры жаўнерыкі.

Што к мамцы ідзе,
Песеньку пяе.
Гэй, гэй, гэй!
Песеньку пяе.

Што к татку ідзе,
У скрыпачку грае.
Гэй, гэй, гэй!
У скрыпачку грае.

К матчысе ідзе,
Горканька плача.
Гэй, гэй, гэй!
Горканька плача.

А ў бары, бары
Тры дарожанькі.
Гэй, гэй, гэй!
Тры дарожанькі.

ОЙ, ЛЯЦЕЛІ ГУСАНЬКІ ЦЕРАЗ САД

Ой, ляцелі гусанькі цераз сад, —
Час табе, Ганусенька, на пасад.
— Ой, ды што вам, гусанькі,
да таго,
Ёсць у мяне ойчанька ля таго.

Ляцела зязюленька цераз сад,
Клікала Гануську на пасад...
— Што табе, зязюленька,
да таго,
Ёсць у мяне матуленька
ля таго.

Скажаць жа мне сесці —
то сяду,
Скажаць жа мне ўстаці —
то ўстану.
Скажаць мне скланіцца —
скланюся,
Я сваёй матуленькі баюся.

РАБІНА

Дзяўчына, дзяўчыначка,
Дзяўчына мая,
Чаму ж ты, дзяўчыначка,
Засмуцілася?

Ой, не ў тую порачку
На свет я прыйшла,
Маці, не падумаўшы,
Замуж аддала.

Ды у тую вёсачку,
Не ў вядомую,
У чужую, сямеячку —
Не ў вясёлую.

Дальняя староначка
Без ветру сушыць,
Няродны татулечка
Без віны журыць.

Вось жыву гадочак я,
Жыву і другі,
А на трэцім годзіку
Занудзілася.

К мамачцы ў госцікі
Захацелася,
Па родным татулечку
Затужылася.

«Голас Радзімы»
Галоўны рэдактар
Наталля САЛУК

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь;
Камітэт па справах рэлігій і нацыянальнасцей пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь;
Беларускае таварыства дружбы і культурнай сувязі з зарубежнымі краінамі;
Беларускае таварыства па сувязях з суайчыннікамі за рубяжом «Радзіма».

Наш адрас: 220005, Рэспубліка Беларусь, Мінск, пр. Ф. Скарыны, 44.
Тэлефоны: (+375-17) 288-11-97 (бухгалтэрыя, тэл./факс), 288-12-80, 284-76-56, 288-17-82.

Пазіцыі рэдакцыі і аўтараў, матэрыялы якіх друкуюцца на старонках «Голасу Радзімы», могуць не супадаць.

Рэгістрацыйнае пасведчанне №81. Падпісны індэкс у Беларусі 63854. Тыраж 2 082 экз. Заказ 1553. Падпісана да друку 8. 7. 2002 г. у 12.00.

Газета набрана і звярстана на рэдакцыйным настольна-выдавецкім комплексе.

Аддрукавана ў друкарні «Беларускі Дом друку» (220041, г. Мінск, пр. Скарыны, 77).